ПРАЛЕТАРЫ УСЯХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

№ 247 (3355) Нядзеля, 27 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

ПАРЫЖ, 26. Агенцтва Гавас паведамляе, што Тардзье, якому даручана стварыць новы ўрад, заявіў, што ён запрапануе сацыялістым прыняць удзел у новым урадзе.

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На гомельскіх прадпрыемствах пачалася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 12-й гадавіны Кастрычніка рэвалюцыі. На вялікіх прадпрыемствах ствараюцца тройкі для падрыхтоўчай працы да сьвят.

«Палесдрук» паладжае 7 экскурсій на фабрыкі і заводы і 2 экскурсіі ў калгасы акругі. Мэталістыя арганізуюць агульна-саюзны вечар і вечары для прадпрыемстваў. Гарбары арганізуюць вечары, прысьвечаныя дасягненьням на сацыялістычным будаўніцтве.

ЯШЧЭ ПРА ВЕЦЕР З ЗАХАДУ

У сваім апошнім выступленьні сакратар ЦК КП(б)Б тав. ВАСІЛЕВІЧ зусім правільна адзначыў, што «ПРЫ АБВОСТРАНАЙ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЕ, ПРЫ РАЗГОРТВАНЬНІ ФАШЫСЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ, НА ЧАЛЕ ЯКІХ СТАЛІ БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫ, ХІСТАНЬНІ АСОБНЫХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ ЗАРАЗ-ЖА СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА КЛЯСАВЫМІ ВОРАГАМІ Ў НАС І ЗА МЕЖАМІ Ў СВАІХ МЭТАХ, ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ».

Правільнасьць гэтага палажэньня цалкам і штодзенна пацьвярджаецца ўсімі тымі водгукамі, якімі напоўнена польская фашысцкая і беларуская нацыянал-фашысцкая прэса на завостраны курс барацьбы нашай партыі з усімі праяўленьнямі нацыянал-дэмакратызму. Ясна, што і хістаньні ўнутры партыі, і адыход ад генэральнай лініі нашай партыі, і простае супраціўленьне клясавай лініі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца вадой на млын ворага. Ужо ня раз адзначалася ў нашай партыйнай прэсе тое зьлаваньне, якім напоўнены замежныя газэты, тыя мамбланы хлусьні, якія пасылаюцца па адрасе БССР і КП(б)Б. І іменна ў гэтым зьлаваньні, у гэтым рэагаваньні ворага лепш за ўсё, больш яскрава і непасрэдна выяўляецца ЎСЯ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАСЬЦЬ нацыянал-дэмакратызму, які выступае супроць большавіцкай палітыкі нашай партыі, уся тая ПРОСТАЯ сувязь, ЯКАЯ ІСНУЕ ПАМІЖ ІМ І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫЗМАМ.

Трэба ясна ўявіць сабе тое, што барацьба супроць нацыянальнай палітыкі партыі, супроць усёй генэральнай лініі партыі, у якіх-бы «нявінных» формах яна не праяўлялася, яна супадае ня толькі з ідэалёгіяй беларускага нацыянал-фашызму, але і з антысавецкімі ваеннымі плянамі польскага фашызму. Такі няўмольны лёгічны закон клясавай барацьбы і колькі-б ня былі пакрыўджаны нашы «ўхілістыя» ўнутры партыі і махровыя нацыянал-дэмакраты па-за яе радамі гэтай заявай, партыя ясна і яскрава гаворыць аб гэтым.

Апошні час на старонках фашысцкай прэсы мы маем даволі частае зьмешчэньне вялікіх артыкулаў, прысьвечаных «беларускай праблеме». Калі ўзяць гэтыя артыкулы, дык усе яны па сваім духу, па сваёй устаноўцы ўвогуле аднолькавыя—яны разглядаюць гэту «праблему» пад кутом погляду барацьбы супроць БССР і падрыхтоўкі вайны з Савецкім Саюзам. Польскі фашызм вядзе жорсткую барацьбу з шырокім нацыянальна-вызваленчым рухам беларускіх працоўных мас. Палёнізацыя і тэрор зьяўляюцца асновай нацыянальнай палітыкі польскіх акупантў. Але ў ажыцьцяўленьні гэтай сваёй палітыкі польскі фашызм знайшоў дасканалых саюзьнікаў і памоцнікаў — беларускую буржуазію, беларускага кулака і яго ідэолёгаў—буржуазную частку беларускай інтэлігенцыі. Дэмагагічныя гэсты і дробныя ўступкі фашызму ніколькі НЕ ЗЬМЯНЯЮЦЬ АСНОЎ ЯГО ПАЛІТЫКІ, бо няма міру, няма і ня можа быць кампрамісу паміж беларускімі працоўнымі масамі і польскай буржуазіяй, польскім памешчыкам, польскім акупантам. Гэтыя два лягеры знаходзяцца ў стане нязгодлівай і пастаяннай барацьбы. І беларускія нацыянал-фашысты, будучы вернымі служкамі польскага фашызму зьяўляюцца тэй сілай, якая дапамагае справе нацыянальнага прыдушэньня, узмацненьню акупацыі, барацьбе з нацыянал-вызваленчым рухам і падрыхтоўкай вайны. Зразумела, усё гэта ідзе побач з «левымі» фразамі, усё гэта маскуецца гутаркамі аб «беларускай нацыянальнай культуры», аб «беларускім народзе» і г. д., і г. д., але за ўсім гэтым хаваюцца фашысцкія і нацыянал-фашысцкія справы.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ПІЛСУДЗКАГА ПАДНАЧАЛЕНА ЯГО ВАЕННЫМ ПЛЯНАМ. Адсюль—галоўная яго задача процістаўіць беларускія працоўныя масы, беларускую інтэлігенцыю камуністычнай партыі, БССР і ўсяму Савецкаму Саюзу. Адсюль—імкненьне знайсьці сабе саюзьнікаў ня толькі ў Заходняй Беларусі, але і ў БССР.

Усякія нацыянал-дэмакратычныя выступленьні ў БССР безадкладна падхапляюцца ўсёй буржуазнай прэсай і раздуваюцца ў «барацьбу супроць камуністычных уплываў Масквы», малююцца, як «прасьледваньне беларусоў Масквой». У гэтых адносінах адбываецца яўная згода паміж польскімі фашыстымі і тым, што гавораць і робяць нацыянал-дэмакраты. Возьмем адносіны да «рускай культуры». У вялікім артыкуле, зьмешчаным у фашысцкай газэце «Глос Правды» пад назвай: «Асьвета і беларускае пытаньне», гаворыцца: «Аднак, найбольшая небясьпека пагражае беларускаму народу з боку рускага народу». Падкрэсьліваючы на працягу ўсяго артыкулу гэту асноўную думку, газэта зусім нядвузначна заяўляе: «Беларуская культура, асобны беларускі нацыянальны арганізм, не гаворачы ўжо аб дзяржаўным арганізьме, можа вырасьці толькі ў барацьбе з рускай культурай, як найбольш яму блізкай і сваяцкай, а таму і найбольш небясьпечнай». Пасьля гэтага, фашысты—аўтар артыкулу тутжа зазначае выхад; гэты выхад у арыентацыі на Захад, на заходнюю буржуазную культуру. Ён гаворыць: «Калі цяперашнія тварцы беларускага руху ў Менску хочуць сапраўды стварыць беларускую нацыянальную культуру, яны павінны шукаць у культуры Заходняй Эўропы процідзеяньня, пануючай цяпер культуры магутнага 100-мільённага рускага народу. Іншымі словамі, беларуская культура можа вырасьці і ўзмацніцца толькі ў барацьбе з рускай культурай».

Хіба ў гэтым пытаньні мы ня бачым простага палітычнага адзінства погляду паміж пілсудчыкамі і нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіяй! Пад відам гутарак аб барацьбе з «рускай культурай» фашызм праводзіць думку аб барацьбе з прапетарскай дыктатурай, з камуністычнай партыяй, аб барацьбе З БЕЛАРУСКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРАЙ і ленінскімі шляхамі разьвіцьця нашай нацыянальнай палітыкі. Тэорыі аб «самавызначэньні», тэорыі аб барацьбе супроць «перайманьня ад Масквы», якія разьвіваюцца нацыянал-дэмакратамі ў нас, у БССР, больш яўна і адкрыта працягваюцца польскімі фашыстамі і вырастаюць ужо ў простыя заклікі да барацьбы з савецкай уладай. Ясна, што наша барацьба за беларускую пралетарскую культуру, ажыцьцяўленьне сапраўднай роўнасьці ўсіх нацыянальнасьцяў, барацьба супроць манаполіі ў справе нацыянальна-культурнага будаўніцтва кучкі буржаазнай інтэлігенцыі, наша выразная клясавая лінія на выпіраньне буржуазных элемэнтаў з усіх займаемых імі пазыцый не па духу нацыянал-дэмакратам і польскім фашыстым. У гэтым адзін з довадаў правільнасьці нашай лініі і барацьбы. А мары аб буржуазнай Беларусі, аб захваце Менску і падначаленьні яго польскаму фашызму ня будуць ажыцьцёўлены

Але прасочым далей разважаньні нашых ворагаў. Узмоцнена папулярызуючы лёзунг барацьбы «супроць Масквы», польскі фашызм зусім нядвузначна вылучае сябе, як сілу, якая «можа дапамагчы» ў барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры ў БССР, супроць чырвонай Масквы. У другім артыкуле, зьмешчаным у тым-жа фашысцкім афіцыёзе «Глос Правды» на тэму «Польская і беларуская інтэлігенцыя», напісаным вядомым пілсудчыкам Т. Галуўка, як асноўны вывад, высоўваецца наступнае палажэньне: «Сілай рэчаў, гэтым найбольш блізкім Захадам для Беларусі зьяўляецца Польшча, для Польшчы-ж беларускі рух быў-бы тэй заставай, якая будзе адкідваць усё далей на ўсход хвалі расійскай культуры, якая нам заўсёды чужая, асабліва ў яе цяперашніх праяўленьнях».

Тут зусім ужо ня утойваюцца сапраўдныя пабуджэньні і пляны фашызму. Далей на ўсход адкінуць уплыў камунізму—вось сэнс гэтага заклiку газэты пілсудчыкаў. Бо зусім ясным зьяўляецца той факт, што за фразамі аб барацьбе з «рускай культурай» у даным выпадку хаваецца заклік да барацьбы з савецкай уладай. Толькі такі, а ня іншы палітычны сэнс трэба ўкладваць у гэтыя разважаньні аб «небясьпецы», якая быццам-бы пагражае беларускаму народу з боку «рускай культуры». І водгукам на гэтыя заклікі польскага фашызму зьяўляецца кожнае нацыянал-дэмакратычнае выступленьне, бо яно, у якой-бы завуаляванай форме не зьяўлялася, фактычна ставіць карэнна пытаньне—СУПРОЦЬ палітыкі партыі і савецкай улады і ТАДЫ РАЗАМ з польскім фашызмам і беларускім нацыянал-фашызмам, або — СУПРОЦЬ нацыянал-дэмакратызму, СУПРОЦЬ беларускага нацыянал-фашызму і тады ЗА палітыку партыі, ЗА разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, ЗА бязьлітасную барацьбу з усімі, хто змагаецца з гэтай палітыкай.

Тут нельга трымацца «сярэдзіны». Сьмешна і наіўна выглядаюць у гэтым сьвятле сьлязьлівыя нараканьні асобных інтэлігенцікаў на тое, што іх «крыўдзяць», што іх «цкуюць» і г. д., і г. д. Гэтыя сьлёзы крыўды яшчэ адзін довад, што гэтыя людзі не адыходзяць ад сваіх буржуазных, нацыянал-дэмакратычных пазыцый, што асобныя з іх у лепшым выпадку не разумеюць усёй сутнасьці перажытага пэрыяду. Справа ня ў крыўдзе аддзельных асоб, а справа ў тым, як кажа зусім правільна т. ВАСІЛЕВІЧ (гэта адносіцца да тых,хто яшчэ не канчаткова зьбіўся з дарогі!), што «ТРЭБА ХУТЧЭЙ, А ТО БУДЗЕ ПОЗНА, ВЫБІРАЦЬ ЦІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У БУДАЎНІЦТВЕ САЦЫЯЛІЗМУ, ЦІ АДДАЦЬ СЯБЕ НА СКАРЫСТАНЬНЕ БУРЖУАЗІІ»...

Бо буржуазія сапраўды скарыстоўвае. Вось хаця-б, як наш вораг зусім яшчэ нядаўна гаварыў аб дзейнасьці Акадэміі Навук. Газэта пілсудчыкаў «Кур'ер Віленскі» ў вялікім артыкуле ад 10-га жніўня 1929 году, выступаючы адносна «праграмнай», як ён называе артыкул у «Зьвязьдзе» «Аб правым ухіле ў КП(б)Б па нацыянальным пытаньні», зазначае, што частка беларускай інтэлігенцыі «паступова вядзе як у рамках партыі, так і па-за імі яскрава - нацыянальную дзейнасьць, якая цалкам супярэчыць праграме кампартыі». «Кур'ер Віленскі» гаворыць далей: «галоўным месцам, што канцэнтруе нацыянальныя групоўкі беларусаў, зьяўляецца створаная з Інбелкульту Беларуская Акадэмія Навук у Менску. Гэта найбольш салідная ў краіне ўстанова, якая аб'ядная ў сваім асяродзішчы беларускія навуковыя сілы, галоўным чынам, пэрыяду перад вайной, далёка стаіць ад патрабаваньняў нацыянальнай палітыкі партыі і насаджвае ўсюды беларускую культуру ў духу яскрава-нацыянальным.

Таму няма нічога дзіўнага, што аслабаненьне пастановай СНК БССР ад адказнай працы ў БАН Ластоўскага і Некрашэвіча было спаткана за кардонам новымі антысавецкімі выпадамі фашыстых і беларускіх нацыянал-фашыстых. Зразумела, што барацьба за клясавую лінію ў Акадэміі Навук сустракае злабу клясавага ворага. Інакш і быць не магло, але з яшчэ большай энэргіяй, з яшчэ большай сілай працоўныя масы на чале з камуністычнай партыяй будуць весьці гэту барацьбу.

Можна было-б падаць шмат прыкладаў для таго, каб паказаць, як зыходзіцца палітычная лінія нацыянал-дэмакратызму з лініяй беларускага нацыянал-фашызму і плянамі польскага фашызму. У гэтых адносінах, як вучыў нас Ленін, трэба час ад часу прыслухоўвацца да голасу нашага непрымірымага клясавага ворага. А гэты голас — голас польскага фашызму — гаворыць аб плянах зьвярэжэньня пралетарскай дыктатуры, аб устанаўленьні ўлады памешчыкаў і капіталістых, аб зьнішчэньні БССР. І толькі сьляпы або заведама сьвядомы вораг можа адмаўляць, што паміж гэтым голасам Захаду і паміж нацыянал-дэмакратычнымі галасамі тут, у БССР няма сувязі. Сувязь ёсьць, яна відавочная і ясная!

Было-б няправільна думаць, што толькі беларускі нацыянал-дэмакратызм зьяўляецца палітычным саюзьнікам польскага фашызму і клясавым ворагам пралетарскай дыктатуры. Гэта адносіцца і да нацыянал-дэмакратызму—польскага і яўрэйскага, гэта адносіцца да вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму і да антысэмітызму. Кожнае праяўленьне русацяпства, а мы яго яшчэ далёка ня выкаранілі (жыў, русацяп!), праяўленьні вялікадзяржаўнага шавінізму знаходзяць свае водгукі на старонках буржуазнай і нацыянал - фашысцкай прэсы. З якой радасьцю падхапляе, асабліва беларуская нацыянал-фашысцкая прэса, усякі факт вялікадзяржаўнага шавінізму. Як смакуюцца праяўленьні антысэмітызму. З якім, нарэшце, здавальненьнем падхапляюцца праяўленьні польскага і яўрэйскага шавінізму! Тут мы бачым карціну чулага адзінства ўсіх сіл, якія супраціўляюцца сацыялістычнаму будаўніцтву і разгорнутаму наступленьню пралетарыяту ўсіх, хто змагаецца з лініяй партыі, усіх, хто цягне яе на дарогу кампрамісаў з кулаком, нэпманам і буржуазнай інтэлігенцыяй.

Таму самы рашучы агонь па ўсіх відах нацыянал - дэмакратызму, асабліва па беларускім, як найбольш небясьпечным у пераважаемы пэрыяд, неаслабная барацьба з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, зьяўляецца лепшым адказам на енкі нашых ворагаў. Адначасова, ідучы па правільных палітычных шляхох, мы з яшчэ большай сілай і актыўнасьцю будзем будаваць сацыялістычную гаспадарку БССР, узмацняць і разьвіваць беларускую пралетарскую культуру, павышаць якасьць нашай нацыянальна - культурнай работы. Антысавецкія ваенныя пляны польскага фашызму і яго саюзьніка — беларускага нацыянал - фашызму наткнуцца на руйнуючы адпор мільённаў найшырэйшых працоўных мас БССР. Такі-ж адпор і такую-ж бязьлітасную сустракалі і будуць сустракаць усе, хто тут у нас грае ў дудку нашага клясавага ворага. Паўтараем — у гэтых адносінах «сярэдзінкі» ня можа быць. Прымірацца—гэта ўсё роўна, што проста дапамагаць ворагу. Патрэбен ясны выбар. Той, хто ня хоча гэтай яснасьці, будзе адкінуты ў бок пераможным сацыялістычным будаўніцтвам, якое разгортваецца пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ленінскай партыі.

БЕЛЫ ТЭРОР У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Агенты паліцыі адкрыта забіваюць рабочых

ВАРШАВА, 25. З Лодзі паведамляюць, што ў часе выступленьня аднаго агітатара на масоўцы рабочых фабрык Будэрмана, невядомы падышоў да прамоўцы Гэрмана і выстраліў у яго. Рабочыя перанесьлі прамоўцу ў аптэку, адкуль ён быў перавезены ў бальніцу ў безнадзейным стане. Невядомы ўцёк.

Паводле паведамленьня газэт, Гэрман гаварыў на масоўцы аб становішчы ў СССР, з прычыны чаго ўзьнікла меркаваньне аб тым, што Гэрман належаў да складу рабоча-сялянскае польскае дэлегацыі, якая наведала СССР і што ён выступаў са справаздачай аб сваёй паездцы. Бундаўскі друк зазначае, што страляўшы, быў агентам паліцыі.

Правакацыйныя выпады польскага друку ня спыняюцца

ВАРШАВА, 25. Сьвістапляска ў бульварным друку вакол савецкага поўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве працягваецца. У сувязі з выдачаю савецкім поўнамоцным прадстаўніцтвам паліцыі заведамага правакатара, які зьявіўся ў поўн. прадстаўніцтва, «Кур'ер Чэрвоны» выступае з новымі «выкрыцьцямі», накіраванымі на гэты раз супроць перакладчыка савецкага вайсковага аташэ Пятра Бязсонава. Газэта падае фантастычную гісторыю аб тым, што Бязсонаў, нібы угаворваў нейкага польскага афіцэра дастаўляць яму шпіёнскія весткі.

Правакацыйныя «выкрыцьці» «Кур'ера Чэрвонага» цалкам перадрукаваны органам піпсучыкаў «Глосам Правды». «Глос Правды», відаць, зьдзіўлены тэй акалічнасьцю, што поўнамоцнаму прадстаўніцтву стала вядома, што выдадзены паліцыі правакатар Міраноўскі быў неадкладна вызвалены з турмы. Газэта прабуе вельмі непераканаўча вытлумачыць гэты факт тым, што сьледчы палічыў магчымым аслабаніць Міраноўскага, бо прызнаў, што ён ня меў ніякага доступу да афіцыйных матар'ялаў.

«АДСТАЎКА ЎРАДУ НЯ БУДЗЕ АЗНАЧАЦЬ ЗЬМЕНЫ ЎРАДУ»

ВАРШАВА, 25. Паводле слоў брата Пілсудзкага, калі ўраду будзе выказана недавер'е, дык ён «згона парляманцкіх звычаяў, падасьць у адстаўку, але гэта ні ў якім выпадку ня будзе азначаць зьмены ўраду, бо той самы ўрад будзе назначаны зноў».

За „падрыў аўтарытэту" паліцыі

ВІЛЬНЯ, 22. Некалькі месяцаў таму назад «Роботнік», «Газэта Варшавска», «АБЦ» і «Вечур Варшавскі» зьмясьцілі ў хроніцы заметку, што адзін з вышэйшых кіраўнікоў варшаўскае паліцыі напіўся ў рэстаране і пабіў кельнэра. Хоць прозьвішча гэтага «высокага кіраўніка» і ня было надрукавана ў газэтах, аднак, галоўны камэндант паліцыі палкоўнік Малешэўскі пачуў, што справа ідзе аб ім і падаў у суд скаргу на рэдактароў вышэйназваных газэт. Міравы суд апраўдаў рэдактароў, але, па пратэсту пракурора, справа перайшла ў акруговы суд, які засудзіў усіх рэдактароў на тры месяцы арышту без замены штрафам. («Кур. Віл.»).

НА ФРОНЦЕ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ

Забастоўка салідарнасьці партовых рабочых Руэна

ПАРЫЖ, 25. Стачком бастуючых ужо 3-ці месяц докэраў Нанта зьвярнуўся ў ЦК унітарнага прафсаюзу партовых рабочых з прапановаю падрыхтаваць правядзеньне аднадзённай забастоўкі ва ўсіх партох у знак салідарнасьці з докэрамі Нанту.

У адказ на гэта ЦК заявіў, што калі прадпрыемцы Нанта не здаволяць патрабаваньняў докэраў, аднадзённая паўсяместная забастоўка будзе неадкладна абвешчана. Лёзунг забастоўкі-салідарнасьці спатканы з вялікім энтузіязмам рабочымі розных партоў Францыі. У якасьці першай перасьцярогі прадпрыемцаў, партовыя рабочыя Руэна, учора на ўласнай ініцыятыве пад кі, раўніцтвам мясцовага ўнітарнага прафсаюзу кінулі работу. Руэнскія партовыя рабочыя заяўляюць, што будуць працягваць забастоўку да абвяшчэньня агульна-французкай аднадзённай забастоўкі. У забастоўцы прымаюць удзел 100 проц. партовых рабочых Руэна.

Касацыйны суд адхіліў скаргу тав. Марты

ПАРЫЖ, 25. Касацыйны суд адхіліў скаргу на справе камдэпутата Марты, які 5-га красавіка г. г. засуджаны да 5 год зьняволеньня, па абвінавачаньні «ў закліку вайскова-служачых да непаслушэньства».

Аб'яднанае выступленьне сацыял-фашыстых і паліцыі супроць гарнякоў у Бэльгіі

ПАРЫЖ, 25. Тысячы рабочых Шарлеруа адгукнуліся на заклік кампартыі, рэвалюцыйнага саюзу гарнякоў і гарнякцкага «камітэту дзейнічаньня» і выступілі в лёзунгамі агульнага навышэньня зарплаты, барацьбы з рэакцыяй і сацыял-фашызмам і абароны Савецкага Саюзу. Акрамя выступленьня рэвалюцыйнае меншасьці гарнякоў Шарлеруа і ў іншых раёнах адбыліся дэманстрацыі рабочых мэталёвых, тэкстыльных і шкляных заводаў, на якіх была абвешчана аднадзённая забастоўка. Забастоўка гарнякоў, ва малым выключэньнем, была ўсеагульнай.

Паводле дадатковых вестак, атрыманых з Шарлеруа, рэфармісцкая дэманстрацыя, якая прайшла «бяз усякіх інцыдэнтаў», адначалася аб'яднаным выступленьнем сацыялістых і паліцыі супроць гарняцкае меншасьці, якая дэманстравала пад баявымі лёзунгамі. Пасьля адмаўленьня рэвалюцыйных гарнякоў падпарадкавацца патрабаваньням рэфармістых і зьняць плякаты з лёзунгамі кампартыі, рэфармістыя заклікалі паліцыю, каб разагнаць рэвалюцыйную дэманстрацыю. Орган бальгійскае кампартыі «Драпо Руж» паведамляе, што паліцэйскія кінуліся на групу гарнякоў і разагналі яе гумовымі палкамі. Арыштавана 17 гарнякоў; некаторыя з іх былі потым высвалены.

Швэдзкія апартуністыя выключаны з партыі

ПАСТАНОВА ПАЛІТБЮРО ШВЭДЗКАЙ КАМПАРТЫІ

СТАКГОЛЬМ, 25. Палітбюро швэдзкай кампартыі пастанавіла выключыць з партыі: Флюга, Чыльбума, Самуэльсона, Эйпара Ульсона, Арвіда Ульсона, Югансона, Мальмроза, Сомбэрга (дэпутат), Адамсона (рэдактар партыйнай газэты ў Гэтэборгу) і Ландэна (рэдактар газэты «Горланс Кур'ір» у горадзе Сунсваль). Усе гэтыя асобы выключаны за працягваньне паклёпніцкай кампаніі супроць партыі і Камінтэрну і за адмову зламыць парляманцкія мандаты. Палітбюро канстатуе, што сваімі паводзінамі гэтыя асобы паказалі, што мэта іх —стварэньне левай сацыял-фашысцкай партыі.

Вэнгэрскія каты пачалі штучнае кармленьне галадаючых

ВЕНА, 25. Паводле апошніх вестак з Будапэшту, галадоўка палітычных зьняволеных у Вэнгрыі працягваецца ва ўсіх турмах. Абаронцы падсудных пацьвердзілі гэта калектыўнай заявай.

Венская «Абэнд» падае жахлівыя падрабязнасьці штучнага кармленьня зьняволеных праз рот, пры гэтым апошніх зьбіваюць да крыві, вядзяюць усьмярцельныя капулі. Сярод удзельнікаў галадоўкі—Грунблят і Бэла-Тот.

Становішча ў раёне Бруха напружанае

ПРАГА, 25. Становішча ў раёне Бруха паранейшаму напружанае. Учора туды, па вестках «Рудэ Право», прыбыло 500 салдат. Служачых капальняў узбройваюць і навучаюць як абыходзіцца са зброяй. Дзеці забастоўшчыкаў абвясьцілі ўчора школьную забастоўку.

Прысуд над камуністкамі ў Сан-Францыска

НЬЮ-ЁРК, 25. У Сан-Францыска слухалася справа 6 дзяўчын - камуністак, прыцягнутых да адказнасьці за арганізацыю піянэрскага лягеру, над якім быў падняты чырвоны сьцяг. Адна з абвінавачаных пакончыла жыцьцё самагубствам да прыгавору. Рэшта — прыгаворваны да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад 5 месяцаў да 5 год.

Крызіс ураду ва Францыі

Фармаваньне новага габінэту даручана Тардзье

ПАРЫЖ, 25. Прэзыдэнт Думерг даручыў Тардзье (старшыня партыі радыкалаў) стварыць новы габінэт. Заўтра Тардзье паведаміць прэзыдэнту, ці можа ён выканаць гэтае даручэньне.

***

ПАРЫЖ, 25. Лідэр сацыялістых Блюм наступным чынам фармулюе пазыцыю сацыялістычнай партыі ў сувязі з урадавым крызісам: 1) сацыялістычная партыя, у выпадку стварэньня ўраду пад кіраўніцтвам радыкалаў, адмаўляецца прымаць удзел у ўрадзе, калі толькі пленум партыі ня вырашыць гэтага пытаньня інакш; 2) сацыялістычная партыя выказваецца супроць стварэньня ўраду Поля Банкура без фармальнага разрашэньня партыі; 3) калі пленум згодзіцца на гэта, сацыялістычная партыя гатова ўзяць на сябе ініцыятыву стварэньня ўраду на чале з членам сацыялістычнай партыі і ня будзе настойваць у гэтым выпадку на забесьпячэньні сацыялістым большасьці ў габінэце. Блюм падкрэсьлівае, што сацыялістычная партыя выказваецца супроць удзелу ў «левым урадзе» пад кіраўніцтвам радыкала, абяцаючы ў тойжа час новаму ўраду поўнае падтрыманьне.

У парляманцкіх колах сьвярджаюць, што большасьць сацыялістычнай фракцыі стаіць на гэтай пазыцыі. Аднак, некаторыя члены фракцыі, на чале з Банкурам і Рэнадэлем, ня супроць таго, каб згадзіцца і на ўдзел у ўрадзе пад кіраўніцтвам радыкалаў.

САВЕЦКА-КІТАЙСКІ КАНФЛІКТ

Масавыя арышты савецкіх грамадзян у Харбіне

ТОКІЁ, 24. Кітайскія вайсковыя ўлады прад'явілі ўправе К.-У. чыг. новае патрабаваньне аб выдачы на ваенныя выдаткі яшчэ 3 мільёнаў кітайскіх долараў.

У Харбіне зноў адбыліся масавыя арышты савецкіх грамадзян.

Патрабаваньні нямецкага консула ў Харбіне адхілены кітайскаю ўладаю

ТОКІЁ, 25. Нямецкі генэральны консул у Харбіне Штобэ зьвярнуўся да кітайскае улады з наступнымі 4-мя хадайніцтвамі аб савецкіх зьняволеных у Сумбэйскім лягеры: 1) в прычыны халадоў перавесьці сумбэйцаў у пустуючыя будынкі ў горадзе, пры чым гэтыя дамы канкрэтна паказаны;

2) аслабаніць з Сумбэі ўсіх жанчын;

3) разьмясьціць сем'і зьняволеных у пустуючых чыгуначных кватэрах;

4) дазволіць яму наведаць усіх арыштаваных, якія сядзяць у ваенным штабе, што да гэтага часу не дазвалялася.

Усе гэтыя патрабаваньні Штобэ былі адхілены кітайскаю ўладаю.

Падрабязнасьці налёту кітайскай паліцыі на будынак савецкага коксульства ў Харбіне

ТОКІЁ, 25. З Харбіна паведамляюць некаторыя падрабязнасьці налёту кітайскай паліцыі на будынак б. Савецкага консульства, у ніжнім паверсе якога знаходзіцца адзел нямецкага консульства па даведках аб справах савецкіх грамадзян. Кітайская паліцыя арыштавала 3-х савецкіх сўпрацоўнікаў у часе выкананьня службовых абавязкаў і аднаго наведвальніка. Улады адмовіліся дапусьціць Штобэ да арыштаваных толькі таму, што яны не жадалі, каб Штобэ бачыў сьляды катаваньняў і зьбіваньняў арыштаваных.

Пагалоўнае ўзбраеньне беларгвардзейцаў

ТОКІЁ, 25. Як паведамляюць з Харбіна, бела-эмігранцкія лідэры адкрыта ставяць пытаньне аб пагалоўным узбраеньні ўсіх эмігрантаў пад выглядам «самаабароны».

Нанкін рыхтуецца да новага правакацыйнага выступленьня

ШАНХАЙ, 23. Паводле вестак агенцтва Рэйтэр, у афіцыйных колах сьцьвярджаюць, што нанкінскі ўрад у хуткім часе выступіць в дэкларацыяй, у якой будуць зьмешчаны «падрабязнасьці перагавораў з савецкім урадам». У заяве мяркуецца паказаць, што з прычыны нежаданьня савецкага ўраду мірна вырашыць канфлікт, палітыка нанкінскага ўраду будзе выходзіць з таго, што часова канфлікт ня вырашаны і з прычыны гэтага неабходна ўзмацніць абарону сібірскае мяжы.

УВАГА ТАСС: ТАСС упаўнаважаны афіцыйна заявіць, што ніякіх перагавораў, апрача сваячасова і поўнасьцю апублікаванага Савецкім урадам абмену нот адносна прапанаванага нанкінскім урадам 27-га жніўня праекту супольнае дэкларацыі не вялося і не вядзецца. Усе нанкінскія заявы пра перагаворы, якія, нібы, адбываліся ці адбываюцца паміж прадстаўнікамі Нанкіна і Савецкага ўраду, зьяўляюцца самаю чыстаю выдумкаю, якую ня раз Савецкі ўрад афіцыйна абвяргнуў, і разьлічаны на тое, каб увесьці ў ману грамадзкую думку ў Кітаі.

Посьпехі камуністычных атрадаў у Кітаі

ШАНХАЙ, 25. Як падае агенцтва Рэйтэр, камуністычныя атрады, лікам каля 5 тысяч чалавек, пад камандаю Чу-Дэ, занялі Паюнскі раён правінцыі Гуандунь, увайшлі ў галоўны горад раёну і разброілі ўрадавыя войскі.

Падрыхтоўка нямецкай кампартыі да 12-й гадавіны Кастрычніка

БЭРЛІН, 25. Заклік саюзу прыяцеляў СССР аб адпраўцы ловай рабочай дэлегацыі ў СССР да 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі з захапленьнем сустрэчаны рабочымі масамі Нямеччыны. Камітэт саюзу штодзённа атрымлівае шмат лістоў і заяў, у якіх яскрава адлюстроўваецца брацкая салідарнасьць з рабочымі і сялянамі СССР. У лістох таксама адзначаецца што, нямецкія рабочыя хочуць перанясьці у СССР рэвалюцыйную практыку, якая ўзмацніць іх уласную клясавую барацьбу. (ТАСС).

***

БЭРЛІН, 23. Нямецкая кампартыя разгортвае ўзмоцненую кампанію да 12-е гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі. Паводле пляну кампартыі, гэты дзень павінен прайсьці пад знакам барацьбы супроць небясьпекі імпэрыялістычнае вайны і супроць пляну Юнга.

Нямецкая кампартыя мяркуе дзень Кастрычнікавае рэвалюцыі абвясьціць пачаткам спаборніцтва паміж пасобнымі ячэйкамі і арганізацыямі партыі, між буйнымі арганізацыямі нямецкае кампартыі і ўсесКП(б), а таксама паміж масавымі рабочымі арганізацыямі Нямеччыны і Савецкага Саюзу.

Самалёт „Краіна Саветаў" у Чыкага

УРАЧЫСТАЕ СПАТКАНЬНЕ ЭКІПАЖУ ГРАМАДЗКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ

ЧЫКАГА, 25. Самалёт «Краіна Саветаў» прыляцеў у Чыкага 24-га кастрычніка, а 22 гадз. 11 хв. Шлях з гораду Салёнага Возера у 2.040 кілёметраў пройдены праз 13 гадз. 40 хв., з пасадкаю ў Норд-Пляттэ. На аэрадроме самалёт сустракалі пам. гарадзкога галавы, прадстаўнікі гандлёвых палат, прадстаўнікі ВОКС і шматлікія арганізацыі прыцеляў СССР. У Чыкага самалёт затрымаецца 3 дні, каб выканаць усе візыты паводле запрашэньня афіцыйных устаноў і грамадзкіх арганізацый. Пры спатканьні «Краіны Саветаў» ваенная авіяцыя ПАЗШ выказала савецкаму экіпажу вайсковую пашану.

***

МАСКВА, 25. Супрацоўніку ТАСС у камісіі Асоавіяхіму СССР па арганізацыі вялікіх савецкіх пералётаў паведамілі, што далейшы плян пералёту «Краіны Саветаў», у сувязі з прыёмам самалёту ў Чыкага і Дэтрайце, некалькі пашыраны: 28-га і 1 кастрычніка «Краіна Саветаў» пяляціць у Дзірборн (пэнтр аўтамабільных і авіяцыйных прадпрыемстваў Форда). Па дарозе з Чыкага ў Дзірборн з самалётам «Краіна Саветаў» будзе ляцець самалёт Форда, які высланы на спатканьне.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Скрыўленьне клясавай лініі ў арганізацыях прафсаюзу тэкстыльшчыкаў

МАСКВА, 26. Прэзыдыум ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў канстатуе, што за апошні час у рабоце раду арганізацый саюзу выкрыта скрыўленьне агульна-клясавай лініі, праяўленьне правага ўхілу і адсутнасьць належнага адпору дробна-буржуазным настроям адсталых груп членаў саюзу. Так, група рабочых фабрыкі імя Шагава адмовілася прыняць выклік рабочых новай Іванава-Вазьнясенскай мануфактуры на сацыялістычнае спаборніцтва.

На Бійскай фабрыцы старшыня фабкому Семілетаў выступіў з контр-рэвалюцыйнай агітацыяй супроць сацыялістычнага спаборніцтва, пры чым некаторыя члены фабкому гэтай агітацыі не перашкаджалі.

На фабрыцы імя Калініна група рабочых адмовілася прымаць удзел у сацыялістычным спаборніцтве і знайшла падтрыманьне сярод некаторых членаў фабкому. Частка р

ЧЫСТКА САВЕЦКІХ ЯЧЭЕК КП(б)Б

Шырэй разгортвайце бальшавіцкую самакрытыку

Толькі разгортваючы самакрытыку не зважаючы на асобы, мы выкрыем скажэньні, хібы і памылкі ў рабоце партыйных ячэек

КРЫТЫКА ГЛЕДЗЯЧЫ НА АСОБЫ

Апартунізм і прымірэнцтва ў практыцы ячэйкі Наркамасьветы

Ужо некалькі дзён ідзе праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы. Чыстка выявіла рад цікавых момантаў з практыкі ячэйкі.

Аб самакрытыцы

«Самакрытыкі зусім ня было»,—сказалі іншыя партыйцы. Беспартыйныя на справаздачным сходзе маўчалі. І толькі пасьля таго, як вычарпаўшы сьпіс прамоўцаў, старшыня праверкому т. **Кеніг** зазначыў, што ня выказаўся ніводзін беспартыйны і прасіў шчыра паведаміць праверкому прычыны маўчаньня, пасьля гэтага запісаліся і выказаліся тры беспартыйныя.

Яны гаварылі аб тым, што ячэйка ня была зьвязана з беспартыйнымі працаўнікамі, ня ўцягвала іх у грамадзкую работу, што самакрытыка пакуль што не разгорнута ў паркамаце, які ведае справамі культурнае рэвалюцыі. Нарэшце, нават і былы нарком т. Баліцкі таксама адзначыў, што «самакрытыкі ня было», а сакратар ячэйкі дадаў да гэтага —«бо ты яе глушыў», і падаў некалькі фактаў зажыму і прасьледваньняў за самакрытыку.

На праверачным сходзе высьветлілася ўся тая няпрыемная і сумная абстаноўка, у якой працавала ячэйка. Замест самакрытыкі члены ячэйкі заўсёды галасавалі за думку наркома. Замест шчырай бальшавіцкай дапамогі—зажым з аднаго боку, і падхалімства—з другога, замест прызнаньня памылак зараз—замазваньне недахватаў—вось атмасфэра, у якой разгортвалася работа ячэйкі. На сходзе агонь крытыкі цалкам накіраваны на т. Баліцкага. Ён якраз першыя два дні адсутнічаў на сходах. Значыць «можна было крытыкаваць». І вось выступаюць т. т. Слонім (намесьнік наркома) і Ошараў (член калегіі НКА) і крытыкуюць... Баліцкага. А аб тым, што **яны** самі рабілі, ніхто з іх ні слова не сказаў.

Апартунізм на практыцы

Ячэйка,—кажа тав. Гурскі,—своячасова рэагавала «на ўчынкі тав. Баліцкага». Але не даводзіла сваё рэагаваньне да канца, Баліцкі імкнуўся зрабіць з ячэйкі прывесак для ланцужка, насадзіць на задворкі, зрабіць толькі палітпрасьветам. Ячэйка змагалася за права мець свой партыйны тэар. Змагалася наступным чынам. На бюро, адночы, бяз Баліцкага прынялі нейкую рэзалюцыю. Потым на наступным бюро Баліцкі настойваў на тым, каб гэтую рэзалюцыю перагледзець. Сталі пераглядаць і ў выніку з рэзалюцыі быў лёс выдомага «козліка», ад якога засталіся «рожкі да ножкі». Шляхам «направак» і «направачак» палітычны тэар гэтае рэзалюцыі быў зусім зьменены. І гэта пры тым самым складзе бюро, пры тым самым сакратары і т. д., якія «своячасова рэагавалі». І так на кожным кроку. Усе апартуністычныя памылкі, нацыянал-дэмакратызм і іншыя факты і зьявы былі рашуча асуджаны ячэйкай толькі тады, калі іх асудзіў верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б.

На сходзе, які быў праведзены разам з ячэйкай заводу **«Дрэваапрацоўшчык»**, ячэйка Наркамасьветы ўхвалила пастанову «перачысьціць» т. Баліцкага. Але, калі ён праходзіў чыстку ў чэрвені г. г., дык выступіла ўсяго 2-3 члены ячэйкі, якія сьпявалі Баліцкаму дыфірамбы. Нават сам сакратар ня выказаўся—ён, бачыце, пісаў пратакол праверкі.... «Своячасова рэагавалі»...

Зажым самакрытыкі, падхалімства, нацыянал-дэмакратызм, бюракратызм--вось з чым падыходзяць да чысткі асобныя партыйцы Наркамасьветы. Апартунізм, прымірэнцтвам—з гэтым багажом прышла ўся ячэйка. Між іншым райком КП(б)Б ня даў на ячэйку характарыстыкі. Цікава чаму?

Падрыхтоўка да чысткі

Слаба ячэйка прыцягнула ў падрыхтоўку да чысткі як партыйцаў, так і беспартыйных. Недаволі працавала партыйна-абсьледваўчая рабочая брыгада. Вывады апошняй фіксуюць тое, што было ў насьцегазэце і пратаколах бюро. Апартунізму ў ячэйцы брыгада не заўважыла. Толькі насьцегазэта разгарнула досыць шырокую работу. Зараз выпускаюцца жывыя цікавыя нумары, якія адбіваюць ход чысткі

Пра самы сход—у наступны раз.

АРГУС.

На чыстцы ячэйкі Белсампрамсаюзу

Ячэйка ня можа ахапіць усёй працы Белсампрамсаюзу, які кіруе да 50 рознымі, раскіданымі па ўсім горадзе арцелямі, у якіх ёсьць па 1-2 камуністыя. Частая зьмена сакратароў, раскіданасьць партыйцаў па асобных арцелях, адсутнасьць радавых партыйцаў (бо амаль усе партыйцы займаюць кіруючыя насады), вялікая частка выхадцаў з другіх партый (Бунд, Поалей-Цыён і інш), а таксама тое, што сацыяльны склад арцеляй у большасьці быў ня вельмі добракасны (там былі былыя гандляры, ліцэнцы і г. д., якія маглі зрабіць уплыў і на няўстойлівых партыйцаў) — усё гэта ўзятае разам паклала свай адбітак на твар і работу ячэйкі. Гэта вымагала ад праверкому выключнае ўвагі, выключнае пільнасьці.

Чыстка цягнецца ўжо больш за 3 тыдні. У чыстцы ячэйкі радавыя рабочыя з заводаў і з арцеляй прымаюць самы актыўны ўдзел. Вяліварная заля клюбу саматужнікаў перапоўнена.

Вось перад гэтай шматсоценнай аўдыторыяй выступае «стары» партыец Камлач. Гэта былы загадчык аргаддзелу Белсампрамсаюзу. Ён мае «добрае» старое мінулае. Вучыўся ў Сьвярдлоўцы і адтуль яго прагналі, як трацкістага.

— За што вас выключылі з упівэрсытэту імя Сьвярдлова, — пытае адзін рабочы.

— Мяне ня выключылі, а выпусьцілі раней тэрміну, бо я меў вялікія посьпехі ў навуках, — тлумачыць Камлач.

Гамэрычны сьмех рабочай аўдыторыі спаткаў такое «тлумачэньне».

— Не, брат, жартуеш. Больш ты нас не абдурыш, — выступае на яўрэйскай мове рабочы тав. Маршак. І тав. Маршак наступова расказаў камісіі, як Камлач абдурыў рабочых Белсампрамсаюзу, як агітаваў за пляцформу Троцкага, як у часе галасаваньня за выключэньне Троцкага з радоў партыі частка рабочых паддалася «працы» Камлача, паверыла яго аўтарытэту, гутаркам і прамовам і галасавала разам з Камлачом супроць выключэньня Троцкага.

— Дудкі, брат, больш ты нам вачэй не затуманіш, — канчае сваю прамову рабочы Маршак.

Калі-ж праверачная камісія стала дамагацца ад Камлача праўды, то апошні абурана заявіў:

— Што вы праверку ператвараеце ў расьсьледваньне. Хіба вы сьледчы орган, ці што.

Тупат ног, шыканьне, сьвіст, шум, крыкі бурай пранесьліся на залі ў знак пратэсту супроць Камлача, які дапусьціў такі ганебны выпад супроць праверкому.

Неўзабаве выступае перад аўдыторыяй другі «стары партыец» **Гожаў.** Па партбілеце ён лічыцца з 1917 году ў партыі.

—Калі вы ўступалі ў партыю, — пытае старшыня праверкому.

— Ня ведаю, — чуецца адказ.

— Дзе ўступалі?

— Не памятаю.

— Нават і гораду не памятаеце?

— Не.

— Партспагнаньне мелі?

— Ня ведаю.

Ня гледзячы на такое ўпартае «няведаньне», усё-ж удаецца высьветліць, што Гожаў за безгаспадарчасьць, неэтычныя паводзіны і інш. у часе папярэдняй чысткі быў выключаны з партыі, меў вымову і г. д.

Тав. Перальман доўга апавядаў аб сваім мінулым, рэвалюцыйных заслугах. Але... перайшоўшы да сваёй сучаснай работы, ён чырванее, запінаецца, падымае вочы ўгару. Выходзіць неяк ня гладка. Мінулае ён лепш памятае, чым сучаснае. Высьвятляецца, як ён у Жакце № 16, працуючы ў якасьці адказнага сакратара, прыладзіў свайго бацьку на добрую кватэру, ашукаўшы пры гэтым рабочага Лосіка, што ў яго была растрата, што ён ня раз здымаўся з работы за дрэннае яе выкананьне і г. д.

Трэба адзначыць, што ў ячэйцы партвыхаваўчая праца вялася вельмі дрэнна. Ужо адзін той факт, што яшчэ зараз ёсьць рабочы-партыец з 7-гадовым партстажам, які да гэтага часу зусім няпісьменны, не ліквідаваў сваёй няпісьменнасьці, сьведчыць аб гэтым.

Можна быць упэўненым, што пры тэй пільнасьці, якую праяўляе праверком, будуць выкрыты ўсе балячкі ячэйкі Белсампрамсаюзу.

ВАЛЕРЫ ВЕРАС.

„Зьвязду" у масы

Нядаўна пры Кастрычнікавым РК КП(б)Б адбылася нарада апоргаў парт'ячэек і ўпоўнаважаных па распаўсюджаньні газэты «Зьвязда». Нарада заслухала даклад аб стане работы па распаўсюджаньні «Зьвязды» ў партыйных ячэйках раёну і сярод беспартыйных рабочых і служачых і аб далейшай рабоце па распаўсюджаньні газэты. Таварышы, што выступалі ў спрэчках, адзначылі слабую работу ячэек па распаўсюджаньні «Зьвязды». На прадпрыемствах «Зьвязда» слаба распаўсюджана.

Так, напрыклад, на фабрыцы «Адраджэньне» на некалькі соцень рабочых выпісваецца ўсяго 30 экз. «Зьвязды» (з іх 26 экз. партыйцамі), дэпо таварная МБВ чыг. на 300 рабочых — 4 экз., пуць пас. МБВ чыг. на 370 рабочых — 10 экз., пчотачнікаў на 630 рабочых — 4 экз., абутковай фабрыкі на 320 рабочых — 13 экз., МЦРК № 2 на 310 супрацоўнікаў — 5 экз., МЦРК № 3 на 200 супрацоўнікаў — 6 экз., МЦРК № 4 на 260 супрацоўнікаў — 15 экз., УМТ'у на 93 супрацоўнікі—11 экз. і г. д. Гэтыя лічбы яскрава сьведчаць аб тым, наколькі ячэйкі выканалі дырэктыву ЦК КП(б)Б (1927 г.) аб прыняцьці належных мерапрыемстваў для пашырэньня тыражу газ. «Зьвязда» аб неабходнасьці вярбоўкі ў чытачы «Зьвязды» больш сьвядомай часткі беспартыйных рабочых і служачых, і як выконваецца лёзунг «Ні аднаго партыйца, які-б ня выпісваў «Зьвязды».

Работа па распаўсюджаньні газэты «Зьвязда» ва ўсіх ячэйках раёну (за выключэньнем 2-3) не зьяўляецца асноўнай нагрузкай упоўнаважанага. Акрамя гэтага ў большасьці ячэек упоўнаважаных па распаўсюджаньні «Зьвязды» зусім няма, а гэту работу праводзяць агульныя зьбіральнікі падпіскі. І таму, упоўнаважаны ня мае магчымасьці зьвярнуць належную ўвагу на распаўсюджаньне «Зьвязды». Бюро ячэек да гэтага часу работу з упоўнаважанымі па распаўсюджаньні «Зьвязды» не зрабілі сустаўной часткай сваёй кіраўнічай дзейнасьці, не заслухоўваюць іх справаздач, не дапамагаюць і нярэдка ня цікавяцца іх работай.

Зараз ва ўморах рэканструкцыйнага пэрыяду, напружанай работы па аднаўленьні пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва роля «Зьвязды»—органу ЦК КП(б)Б — падзвычайна вялікая.

Таму партыйныя арганізацыі павінны асабліва зараз клапаціцца аб распаўсюджаньні «Зьвязды» сярод партыйцаў і беспартыйных працоўных мас. Партыйныя арганізацыі павінны ўцяміць, што справа распаўсюджаньня «Зьвязды» ня ёсьць справа толькі самой рэдакцыі, а ёсьць справа ўсёй КП(б)Б, у першую чаргу нізавых ячэек.

Пасьпяховасьць у рабоце па распаўсюджаньні «Зьвязды» будзе толькі тады, калі будзе створан моцны, працаздольны інстытут ячэйкавых упоўнаважаных. Гэта значыць, што ў кожнай ячэйцы павінен быць вылучаны таварыш, які-б клапаціўся аб распаўсюджаньні «Зьвязды». Работа па распаўсюджаньні «Зьвязды» павінна зьяўляцца асноўнай і галоўнай нагрузкай, а не дагрузкай да 3-5 абавязкаў таварыша, спэцыяльна вылучанага для гэтай работы, з тым, каб ён меў магчымасьць аддаць максымум увагі справе распаўсюджаньня «Зьвязды».

ПАРХІМЧЫК.

Узброіцца тэорыяй і ўзмацніць дысцыпліну

Праверана партыйная ячэйка саюзу нархарчаваньня (Менск), якая складаецца з 22 членаў і кандыдатаў партыі. Чыстка паказала, што ячэйка ў асноўным зьяўляецца здаровым і ідэалёгічна вытрыманым калектывам. Ячэйка своячасова і дасканала прапрацавала важнейшыя пастановы і дырэктывы партыі. Пастановы 16 партканфэрэнцыі, XII зьезду КП(б)Б і VI кангрэсу Камінтэрну прапрацоўваліся на гуртках і агульных сходах ячэйкі, на якіх прысутнічалі беспартыйныя.

Але на дасягнутым супакойвацца нельга. У ячэйцы ёсьць яшчэ шмат камуністых, якія палітычна і тэарытычна малапісьменныя. Гэтыя таварышы яшчэ не зразумелі поўнасьцю пастаноў партыі па важнейшых палітычных пытаньнях і таму ў ячэйцы жэлі месца ідэалёгічныя хістаньні і выступленьні супроць правільнай лініі. Так, адзін таварыш пры абгаварэньні на сходзе ячэйкі пытаньня аб выключэньні **Троцкага** з партыі хістаўся і хацеў устрымацца ад галасаваньня за выключэньне Троцкага з партыі. Ячэйка рашуча рэагавала на гэты выпадак і растлумачыла гэтаму партыйцу памылковасьць і шкодлівасьць яго ўчынку. Пасьля гэтага ён шчыра прызнаў сваю памылку і галасаваў за выключэньне Троцкага з радоў УсеКП(б). Другі член ячэйкі выказаў думку аб тым, што партыя вядзе няправільную палітыку ў адносінах вёскі. Ячэйка таксама рашуча рэагавала на гэты ўчынак.

Нельга не адзначыць, што ў ячэйцы ёсьць факты парушэньня партыйнай этыкі і дысцыпліны. Ня зьнішчаны яшчэ выпадкі п'янства і склочніцтва. Асобныя партыйцы, як адказныя савецкія працаўнікі, не змагаліся з бюракратызмам і цяганінай і нават самі ў асобных выпадках бюракратычна адносіліся да работы. Камісія завастрыла ўвагу ячэйкі на барацьбе з гэтымі хваравітымі зьявішчамі і зрабіла некаторыя арганізацыйныя вывады. 5 камуністых за п'янства, безгаспадарчасьць, невыкананьне дырэктыў і бюракратызм атрымалі партыйныя спагнаньні. 3 партыі выключаны толькі адзін член ячэйкі. Гэта тав. Гаўштэйн, якая выключана з партыі за пасыўнасьць.

Р.

Чыстка ячэйкі КП(б)Б Белдзяржстраху

Сёньня, 27-га кастрычніка ў памяшканьні Дзяржстраху (рог Савецкай і Камсамольскай вуліц, уваход са двара) пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б Белдзяржстраху.

Запрашаюцца ўсе беспартыйныя супрацоўнікі Белдзяржстраху і камуністыя, беспартыйныя рабочыя і работніцы з прымацаванай галянтарэйнай фабрыкі.

У панядзелак, 28-га кастрычніка г.г., роўна, а 7-й гадзіне ўвечары, у залі засяданьня СНК (памяшканьне ЦВК і СНК, Пляц Волі, 17), адбудзецца агульны адкрыты сход парт'ячэйкі па праверцы і чыстцы членаў і кандыдатаў ячэйкі КП(б)Б пры ЦВК, СНК і Дзяржпляну.

Прысутнасьць членаў і кандыдатаў партыі абавязкова.

На чыстку запрашаюцца ўсе супрацоўнікі ЦВК, СНК і Дзяржпляну і рабочыя фабрыкі «Чырвоны Тэкстыльшчык» разам з жонкамі.

Просьба да іншых членаў саюзу в прадпрыемстваў і ўстаноў прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

Бюро ячэйкі КП(б)Б.

Як буржуазны прафэсар вульгарызуе калектывізацыю

Пастаўленая партыяй і савецкай уладай задача аб'яднаньня дробных раскіданых сялянскіх гаспадарак з адсталай тэхнікай вытворчасьці ў буйныя аграмаджаныя калектыўныя гаспадаркі з сучаснай машыннай тэхнікай знайшла жывы водгук сярод бядняцка-сераднякіх мас вёскі. Належным довадам гэтага зьяўляецца гіганцкі ўзрост за апошні час калгасаў. Шпаркім тэмпам ідзе як колькасны, так і якасны ўзрост іх. Калі два гады таму назад на адзін калгас у Беларусі прыходзілася плошча ў сярэднім у 60-70 гэкт., то ў сучасны момант яна складае больш за 200 гэкт. Ёсьць ужо калектыўныя аб'яднаньні з некалькіх вёсак на плошчы ў 2.000 і нават у 4.000 гэкт. Гэтым самым канчаткова паносіцца ўдар рэакцыйным буржуазным і дробна-буржуазным тэорыям-ілюзіям аб ідэальным разьвіцьці індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

Ня гледзячы на гэта, ёсьць яшчэ імкненьні сярод некаторых буржуазных вучоных (праўда, адзіночак) нанесьці ўдар будаўніцтву калгасаў, што моцна разьвіваецца ў СССР. Яны імкнуцца стварыць думку, што будаўніцтва калгасаў—зьявішча яшчэ няўстойлівае, нясталае. Гэтыя вучоныя з уласьцівымі ім выкрутасамі імкнуцца адабраць ад калгасаў іх сацыялістычны зьмест, упадабляючы іх звычайным с.-г. таварыствам, што існуюць у капіталістычных краінах. Нарэшце, праціставячы калгасы ўсёй сыстэме каапэрацыі, яны жадаюць вырваць калгасы з сыстэмы каапэрацыі, каб пазбавіць апошнюю яе вытворчай базы ў выглядзе буйной аграмаджанай калектыўнай гаспадаркі і тым самым нанесьці ўдар усёй сыстэме каапэраваньня (у тым ліку і будаўніцтву калгасаў).

Да ліку гэтых вучоных належыць праф. Хаўке. У сваім артыкуле «Земельные товарищества в Пруссии по закону 1920 г.», зьмешчаным у апошнім нумары часопісі «Записки Беларускай с.-г. акадэміі», праф. Хаўке супастаўляе с.-г. калектывы СССР з зямельнымі таварыствамі ў Прусіі, прычым як тым, так і другім дае агульную назву—зямельныя калектывы. Зазначыўшы ў пачатку артыкулу агульнай фразай на тое, што паміж аграрным ладам СССР і Захаду ёсьць розьніца, праф. Хаўке сьпяшаецца адзначыць, што гэту «розьніцу ня трэба ўяўляць сабе вельмі груба і прасталінейна. Ня трэба думаць, што ўвесь наш аграрны лад прасякнуты на ўсе 100 проц. аграрным калектывізмам, а ў буржуазных краінах яго зусім няма». (Стар. 1).

Аўтар спасылаецца на тое, што ў буржуазных краінах некаторыя спэцыяльныя галіны сельскае гаспадаркі (перапрацоўка і збыт малака, пабудова мэліярацыі і інш.) калектывізаваны, і што гэта калектывізацыя мае нават прымусовы характар. Як ня хітра замаскаваны тут думкі аўтара, аднак, зьмест іх відавочны.

Аўтар хоча сказаць, што калектывізацыя ў СССР ня ёсьць яшчэ сацыялістычная калектывізацыя і што такая-ж калектывізацыя ёсьць і ў буржуазных краінах (напрыклад, зямельныя таварыствы ў Прусіі).

Няма патрэбны даводзіць аўтару сацыялістычны характар калектывізацыі СССР, паколькі цяпер нават пізнэр бачыць і ведае, што гэта калектывізацыя вядзе да поўнага аграмаджаньня сельскае гаспадаркі.

Мы толькі лічым патрэбным зьвярнуць увагу аўтара на тое, як ацэньваліся і ацэньваюцца марксыстымі с.-г. таварыствы на Захадзе.

Такую ацэнку мы знаходзім у Ул. І. Леніна, дзе гаворыцца, што хоць таварыствы дробных сельскіх гаспадарак у капіталістычных умовах і зьяўляюцца зьявяном эканамічна прагрэсу, але «выражаюць яны пераход да капіталізму, а зусім не да калектывізму» (Ленін т. IX стар. 11 выд. 1925 г.). Гэтае дасканалае палажэньне было накіравана супроць рэвізіянэраў, якія сьцьвярджалі, што с.-г. таварыствы ў капіталізме, што ў сучасных умовах зьяўляюцца формай кастычных умовах зьяўляюцца формай калектывізму і значыцца панацэяй ад калектывізму і значыцца панацэяй ад усіх зол капіталізму. Палажэньне гэта цалкам накіравана і супроць буржуазнага ідэолёга праф. Хаўке, які сьцьвярджае, што зямельныя таварыствы на асушцы і скарыстаньн балот у Прусіі адсутнічаюць форму калектывізацыі. Супастаўляючы далей прускія зямельныя таварыствы з калгасным будаўніцтвам у нас, аўтар выказвае моцнае здавальненьне тым, што «практычны бок справы прапрацаваны там досыць дэтальна і глыбока» у той час, як «у нашых работах па калгасным будаўніцтве галоўная ўвага зьвернута на ідэалёгічны і агітацыйна-прапагандысцкі бок справы». (57).

Ня прыходзіцца многа гаварыць аб тым, наколькі буржуаны прафэсар скажае працу партыі і савецкай улады па калгасным будаўніцтве. Для кожнага не настроенага супроць калектывізацыі чалавека ясна, што партыяй і савецкай уладай праводзіцца вялізная практычная работа па арганізацыі і аказаньні ім матар'яльна-тэхнічнай дапамогу. Праўда—побач з гэтым ажыцьцяўляецца і вялізная работа ідэалёгічнага характару—па растлумачэньні бядняцка-сераднякім масам выгады буйной аграмаджанай калектыўнай гаспадаркі, якая пазбаўляе гэтыя групы вёскі ад эксплёатацыі іх з боку кулацтва. Вось гэта праца не па душы апалёгету буржуазнага ладу, апалёгету разьвіцьця кулацкае гаспадаркі. Таму ён і выступае супроць тэй ідэалёгічнай работы, якая праводзіцца сярод бядняцка-сераднякіх мас вёскі па ўцягненьні іх у калгасы і барацьбе з кулацтвам. Але больш за ўсё незадаволены праф. Хаўке ў нашым калгасным будаўніцтве тым, што «ў той час, як на Захадзе зямельныя калектывы (сутнасьць гэтых калектываў намі высьветлена вышэй. **П. П.**) ня ўключаны ў агульны каапэрацыйны фронт, мы гэта робім з усёй рашучасьцю» (57).

Праф. Хаўке далей зазначае, што калгасы не павінны ўключацца ў агульную каапэрацыйную сыстэму, бо хаця ў адносінах будаўніцтва іх і абвешчана добраахвотнасьць, але на практыцы калгаснага будаўніцтва ніякай добраахвотнасьці няма.

Як довад гэтага, праф. Хаўке падае той факт, што калі толькі частка сялянскіх двароў хоча аб'яднаць свае гаспадаркі ў калгас, то прыходзіцца выдзяляць тых, хто жадае аб'яднацца. У выніку гэтага выдзяленьня будзе парушана разьмеркаваньне палос, сеназварот двароў тых, хто не жадае ісьці ў калгас. Справа аказваецца ўскладняецца яшчэ тым, што... «выдзелу для калгасаў у нас належаць не далейшыя і горшыя землі, а бліжэйшыя і лепшыя» (58). Дзеля таго, што тыя, хто не жадае ісьці ў калгас, сваёй згоды на такое выдзяленьне не дадуць, то ў адносінах да іх прыдзецца ўжыць прымус. Тут праф. Хаўке канчаткова скідае надзетую раней маску і апранаецца ў тогу абаронцы кулацкіх гаспадарак. Ён дзівіцца таму, што савецкая ўлада прадстаўляе сялянскай беднаце пры аб'яднаньні яе ў калгас бліжэйшыя і лепшыя землі і гэтым парушае інтарэсы тых гаспадарак, што не жадаюць ісьці ў калгас (кулацкіх гаспадарак). Абураны гэтым праф. Хаўке кажа: «Прымусы вострыя дапасоўвае прускі закон 1920 г.; прымусы ўжывае і савецкі зямельны кодэкс» (60). Абуроньне праф. Хаўке савецкім зямельным кодэксам, пабудаваным на клясавым прынцыпе ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, ня новае.

Аб гвалце і прымусах у адносінах да буржуазіі з боку савецкай улады крычаць усе ворагі савецкай улады. Ва ўнісон ім цьвердзіць аб прымусовым характары савецкага кодэксу і ідэолёг буржуазіі праф. Хаўке. Незадаволены праф. Хаўке зямельнай палітыкай савецкае ўлады і таму, што ў прусіяшчэ і таму, што ў прускім зямельным таварыстве ўсякі, хто жадае выйсьці з таварыства, можа прадаць зямлю іншай асобе, у калгасным будаўніцтве СССР гэтага няма.

Такое палажэньне праф. Хаўке, як абаронца буржуазнай прыватнай уласнасьці, лічыць няправільным, бо хоць... «Гэта зямля (уключаная ў калгас. П. П.) у зьвязку з абвешчанай нацыяналізацыяй не складае ўласнасьці сялян, але гэта ўсё-ж зямля «бацькоў і дзядоў», «крывёю і потам палітая», за якую царскаму ўраду заплачаны вялікі выкуп і якая савецкай уладай пакінута ў руках сялян на правах сталага безвараротнага карыстаньня» (60). У адказ на гэта прыходзіцца толькі спачуваць праф. Хаўке. У той час, як ён пралівае кракадзілавыя сьлёзы па зьнішчанай дыктатараў пралетарыяту прыватнай уласнасьці на зямлю, жорстокія і няўважлівыя да буржуазнага прафэсара сялянне бязьлітасна зьнішчаць межы зямель, якімі яны карыстаюцца, уключаючы апошнія ў грамадзкую апрацоўку, у буйныя аграмаджаныя калектыўныя гаспадаркі. Як тут не пашкадаваць буржуазнага прафэсара, думкі якога аб прыватнай уласнасьці на зямлю, аб кампэнсацыі за зямлю падаяляе толькі невялікая група кулацкіх гаспадарак, інтарэсы якіх абараняе зпраф. Хаўке.

У канцы артыкулу праф. Хаўке пярэчыць супроць таго, што калгасы ўключаюцца ў агульную сетку каапэрацыі, сьцьвярджаючы, што... «уключэньне калгасаў у сыстэму калгасаў, у сыстэму каапэрацыі зробіць у нас калгаснаму будаўніцтву адмоўную паслугу. Калгасы дужа рэзка адрозьніваюцца ад асноўных тыпаў каапэрацыі, каб уключэньне іх у агульна-каапэрацыйны фронт магло спрыяць посьпеху справы» (62).

Для нас ужо досыць ясны манэўр праф. Хаўке. Процістаўячы калгасы каапэрацыі і жадаючы вырваць іх з агульнай сеткі каапэрацыі, праф. Хаўке адкрыта выступае супроць каапэрацыйнага пляну Леніна, які ўключае ў сябе ўсю сыстэму каапэраваньня, у тым ліку і стварэньне буйнай аграмаджанай калектыўнай гаспадаркі.

Праф. Хаўке вельмі непакоіць гіганцкі посьпех будаўніцтва калгасаў як у БССР, так і ва ўсім СССР. Прапануючы выключыць калгасы з агульнае сыстэмы каапэрацыі ў мэтах быццам-бы самдзейнічаньня пасьпяховаму будаўніцтву калгсаў, праф. Хаўке імкнецца нанесьці ўдар як працэсу стварэньня буйнае аграмаджанае калектыўнае гаспадаркі, такі ўсёй сыстэме каапэрацыі, паколькі яна страціла-б базу буйной калектыўнай вытворчасьці. Ён стогне аб прымусах у калгасным будаўніцтве, бо пасьпяховае разьвіцьцё гэтага будаўніцтва наносіць канчатковы ўдар кулаку. З упадам кулака патухае апошняя думка буржуазнага ідэолёга.

У заключэньне прыходзіцца вельмі шкадаваць аб тым, як магла рэдакцыя часопісі трапіць у хітрую пастку буржуазнага прафэсара і зьмясьціць у самым пачатку часопісі яго артыкул, зьвяртаючы ўвагу чытачоў, як на артыкул «досыць цікавы» і не згаджаючыся толькі з вывадам аўтара аб адмове ад прынцыпу добраахвотнасьці і выдзяленьні сыстэмы калгасаў з агульнай каапэрацыйнай сыстэмы» (62).

Рэдакцыя часопісі зусім ня ўбачыла, як клясавы вораг імкнецца нанесьці ўдар калектывізацыі ў СССР, грубейшым чынам вульгарызуючы яе, адбіраючы ў яе сацыялістычны зьмест, як ён адначасова выступае ў ролі апалёгета кулацтва, аплакваючы парушэньне інтарэсаў гэтай групы пры калгасным будаўніцтве.

ПІНЧУК.

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ СТВАРЭНЬНІ САЮЗНАГА НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТУ ЗЯМЛЯРОБСТВА

У галіне нашага гаспадарчага будаўніцтва і, у прыватнасьці, у сельскай гаспадарцы Беларусі мы маем рад дасягненьняў. Гэта ясна адзначыў у сваёй рэзалюцыі апошні верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б. Калектыўнае будаўніцтва ў Беларусі, якое разгарнулася за апошнія два гады, паказала ўсю блізарукасьць плянавых меркаваньняў у гэтай частцы. Яшчэ год таму назад у некаторых афіцыйных працах адмаўлялася магчымасьць пашырэньня сацыялістычных форм сельскай гаспадаркі, саўгасаў і калгасаў на тэрыторыі Беларусі. Гэта ўгрунтоўвалася так зв. «мясцовымі асаблівасьцямі». Жыцьцё паказала хвасьцізм плянаваньня і недаўлік кіруючымі органамі (Наркамзем, Наркамасьветы) магчымасьцяй калектывізацыі вёскі.

Быў дапушчаны цэлы рад скажэньняў у галіне зямельнай і сельска-гаспадарчай палітыкі. Замест калектывізацыі рабілася ўстаноўка на стварэньне буйных культурных кулацкіх гаспадарак (справа Мароза і інш.). Лёзунг «Абагачайся селянін' наогул» праводзіўся на практыцы паасобнымі кіруючымі работнікамі Наркамзему.

Верасьнёўскі пленум ЦК партыі Беларусі даў аднадушны рашучы адпор правым устаноўкам у галіне зямельнай і сельска-гаспадарчай палітыкі і даў выразныя дырэктывы і паказаньні. Сацыялістычнае будаўніцтва, якое шпарка разгортваецца, і рашучае наступленьне на кулацка-капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі высоўваюць рад новых задач перад зямельнымі органамі ў пытаньнях плянаваньня сельскай гаспадаркі і ўвязкі яе з прамысловасьцю. Нам патрэбна пабудова электра-ўстановак, трактарных станцый, вялікіх камбінаваных прадпрыемстваў па пераапрацоўцы сельска - гаспадарчых прадуктаў, якія-б забясьпечвалі пры мінімуме затрат максымум эфэкту, ня толькі з пункту погляду паасобных раёнаў, але і ўсяго Савецкага Саюзу цалкам.

Гэта, на нашу думку, першая акалічнасьць, якая прымушае ставіць пытаньне аб стварэньні адзінага кіруючага і плянуючага цэнтру сельскай гаспадаркай, накшталт Саюзнага Народнага Камісарыяту Зямляробства.

Індустрыялізацыя Савецкага Саюзу часамі разумеецца так, што будуй фабрыкі і заводы, а сырэц прывозь за тысячы вёрст. Як на добры прыклад, у Беларусі можна паказаць на адсутнасьць увагі да разгортваньня саматужнай прамысловасьці на мясцовым сыры, дрэваапрацоўчая справа, тарфяная і г. д.

Спэцыялізацыя паасобных раёнаў Савецкага Саюзу і ў сельска-гаспадарчых адносінах, зразумела, памечана ходам эканамічнага і натуральнага разьвіцьця іх. А значыць і адпаведнае плянаваньне ў галіне падрыхтоўкі для прамысловасьці сырцу, з аднаго боку, забесьпячэньне раёнаў адпаведнымі сродкамі вытворчасьці ці спажываньня, з другога боку, канкрэтна высоўвае задачу стварэньня адзінага кіруючага цэнтру. Можна пералічыць дзесяткі выпадкаў, калі адсутнасьць адзінага цьвёрда навукова-ўгрунтаванага пляну надзвычайна цяжка адбіваецца на ўсёй рабоце. Напрыклад, у БССР мэліярацыя, якая, да рэчы, знаходзіцца на саюзным бюджэце. Цэлы рад пытаньняў, якія падлягаюць вывучэньню ў гэтай галіне па сутнасьці зьяўляюцца пытаньнямі ня толькі беларускага значэньня. Але яны застаюцца напастаўленымі і нераспрацаванымі з-за адсутнасьці сіл і належнай колькасьці сродкаў. Таму сродкі, якія затрачваюцца, не даюць таго эфэкту, які можна было-б атрымаць. Практыка паказала, што мэліярацыя ва ўмовах Беларусі зьяўляецца адным з рэнтабэльнейшых мерапрыемстваў. Тут адкрываюцца неабмежаваныя магчымасьці вытворчасьці такіх культур, як лён, каноплі на балотных мэліяраваных землях. У гэтым сырцы мае вялікую патрэбу наша прамысловасьць. Ня гледзячы на гэта, разьвіцьцё вытворчасьцяй сярод бядняцка-сераднякіх мас вёскі, якія сьцьвярджаюць, што... «уключэньне калгасаў у сыстэму калгасаў, у сыстэму каапэрацыі зробіць у нас калгаснаму будаўніцтву адмоўную паслугу. Калгасы дужа рэзка адрозьніваюцца ад асноўных тыпаў каапэрацыі, каб уключэньне іх у агульна-каапэрацыйны фронт магло спрыяць посьпеху справы» (62).

Для нас ужо досыць ясны манэўр праф. Хаўке. Процістаўячы калгасы каапэрацыі і жадаючы вырваць іх з агульнай сеткі каапэрацыі, праф. Хаўке адкрыта выступае супроць каапэрацыйнага пляну Леніна, які ўключае ў сябе ўсю сыстэму каапэраваньня, у тым ліку і стварэньне буйнай аграмаджанай калектыўнай гаспадаркі.

Праф. Хаўке вельмі непакоіць гіганцкі посьпех будаўніцтва калгасаў як у БССР, так і ва ўсім СССР. Прапануючы выключыць калгасы з агульнае сыстэмы каапэрацыі ў мэтах быццам-бы самдзейнічаньня пасьпяховаму будаўніцтву калгсаў, праф. Хаўке імкнецца нанесьці ўдар як працэсу стварэньня буйнае аграмаджанае калектыўнае гаспадаркі, такі ўсёй сыстэме каапэрацыі, паколькі яна страціла-б базу буйной калектыўнай вытворчасьці. Ён стогне аб прымусах у калгасным будаўніцтве, бо пасьпяховае разьвіцьцё гэтага будаўніцтва наносіць канчатковы ўдар кулаку. З упадам кулака патухае апошняя думка буржуазнага ідэолёга.

У заключэньне прыходзіцца вельмі шкадаваць аб тым, як магла рэдакцыя часопісі трапіць у хітрую пастку буржуазнага прафэсара і зьмясьціць у самым пачатку часопісі яго артыкул, зьвяртаючы ўвагу чытачоў, як на артыкул «досыць цікавы» і не згаджаючыся толькі з вывадам аўтара аб адмове ад прынцыпу добраахвотнасьці і выдзяленьні сыстэмы калгасаў з агульнай каапэрацыйнай сыстэмы» (62).

Рэдакцыя часопісі зусім ня ўбачыла, як клясавы вораг імкнецца нанесьці ўдар калектывізацыі ў СССР, грубейшым чынам вульгарызуючы яе, адбіраючы ў яе сацыялістычны зьмест, як ён адначасова выступае ў ролі апалёгета кулацтва, аплакваючы парушэньне інтарэсаў гэтай групы пры калгасным буд

...льные калдагаваровы ператварыць у шырокую палітычную кампанію

Калдагавор—узаемнае абавязацельства рабочых і гаспадарнікаў выканаць кантрольныя лічбы другога году пяцігодкі

(На сходзе актыву Кастрычнікавага раёну)

У пачатку свайго дакладу на актыве Кастрычнікавага раёну г. Менску аб калдагаворнай кампаніі 1929-30 г. тав. Розін спыніўся на новых момантах у кампаніі.

У мінулым годзе, ня гледзячы на дырэктывы партыйных і прафесыянальных органаў, калдагаворная кампанія, у большасьці месц, была праведзена, як вузка-практычная кампанія, а не гаспадарча-палітычная.

Зараз нам трэба ўлічыць памылкі мінулага году. **Мы будзем праводзіць кампанію пераключэньня калектыўных дагавораў, як шырокую гаспадарча-палітычную кампанію.** Перавышэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў гэтым годзе, яшчэ большае ўзмацненьне гэтых тэмпаў у будучым годзе абавязвае нас канцэнтраваць увагу пры прадачах выкананьня кантрольных лічбаў і 5-гадовага пляну індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі.

У часе кампаніі мы павінны даць самы рашучы бальшавіцкі адпор рвацкім нездаровым настроям адсталых груп, выпазнам трацкістых і правых ухілістых, якія, бязумоўна, будуць імкнуцца скарыстаць калдагаворную кампанію ў сваіх інтарэсах.

Ці значыць гэта, што мы адмаўляемся ад абавязкаў абароны праўных, эканамічных і культурных запатрабаваньняў рабочых мас. Ні ў якім разе. Наадварот, мы **павінны пашырыць гэту работу, увязваючы яе з агульнымі інтарэсамі рабочае клясы, а не з інтарэсамі асобных цэхаў і групак.**

У мінулым годзе мы намецілі па рэспубліканскай прамысловасьці рост намінальнай зарплаты на 8 проц., прадукцыйнасьці працы — на 20 проц. У выніку гадавой работы мы дасягнулі росту намінальнай зарплаты на 11 проц., прадукцыйнасьці працы — на 24 проц.

У гэтым годзе мы намячаем рост намінальнай зарплаты на 8 проц., рост прадукцыйнасьці працы — на 26,8 проц.

Тав. Розін адзначае, што ў шкляной, запалкавай і ільна-прадзільнай вытворчасьці рост зарплаты адстае ад сярэдняй зарплаты па рэспубліканскай прамысловасьці, ня гледзячы на тое, што ў мінулым годзе былі адпушчаны значныя сумы на павышэньне зарплаты па гэтых галінах прамысловасьці.

Калі ў 1927-28 годзе зарплата па прадпрыемствах шкляной прамысловасьці складала 91 проц. сярэдняй зарплаты рэспубліканскай прамысловасьці, то ў 1928-1929 годзе яна раўнялася толькі 80 з паловай проц., па запалкавай прамысловасьці ўдзельная вага зарплаты ў адносінах да сярэдняй зарплаты ўсёй прамысловасьці зьнізілася з 82,5 проц. да 72,2 проц. Такім чынам, мы бачым, што разрыў зарплаты павялічыўся. Гэта тлумачыцца тым, што па радзе галін прамысловасьці перавышаны намечаны рост зарплаты.

Наша задача — **даць прыбаўку для падцягваньня адсталых галін прамысловасьці.** Для гэтай мэты асыгнавана 175 тысяч рублёў: 70 тысяч атрымае шкляная прамысловасьць, 55 тысяч — запалкавая і 50 тысяч ільна-прадзільная.

Вельмі важнае значэньне набывае зараз пытаньне аб **рэальнай зарплаце** — мы намячаем у гэтым годзе рост рэальнай зарплаты на 11 проц. (8 проц. росту намінальнай зарплаты і 3 проц. зьніжэньня бюджэтнага набору). У гэтай справе вялікую ролю павінна адыграць **рабочая каапэрацыя.** Але яна ні ў якім разе ня справіцца са сваімі задачамі без дапамогі прафесыянальнай арганізацыі і рабочай грамадзкасьці.

Калектыўныя дагаворы раней на сутнасьці зьяўляліся аднабокімі абавязкамі. **Зараз прафсаюзы і рабочыя павінны ўзяць на сябе рад абавязкаў па забесьпячэньні належнага тэмпу індустрыялізацыі і рэканструкцыі прамысловасьці. Калдагавор павінен зьявіцца двухбаковым абавязкам.**

Тав. Розін адзначае, што **новыя калдагавары не павінны пагоршыць праўнага і бытавога становішча рабочых, трэба захаваць дасягненьні леташняй кампаніі.**

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на мерапрыемствы па **ахове працы.** У гэтых адносінах справа абстаіць даволі дрэнна. У мінулым годзе было заключана дагавароў па ахове працы на 760 тысяч рублёў, выканана — на 205 тысяч рублёў. Папертрэст, напрыклад, выканаў мерапрыемствы па ахове працы на 23 тысячы рублёў, а падпісаў дагавор на 109 тысяч руб. Гарбарня «Бальшавік» падпісала дагавор на 17 тысяч, выканала — на 1 тысячу. **Трэба пакончыць з такімі злачынныміадносінамі да мерапрыемстваў па ахове працы.**

У заключэньне т. Розін адзначыў, што пасьпяховае правядзеньне калдагаворнай кампаніі залежыць ад **шырокага ўцягненьня ў яе рабочых мас і ўдзелу друку і насьценгазэт.**

З прамовай аб палітычным значэньні кампаніі выступіў сакратар Кастрычніцкага райкому т. **Конюхаў,** які адзначыў, што **жыцьцё перавярнула ўсе меркаваньні і прароцтвы ныцікаў і правых ухілістых.** Мы перавыканалі намечаны тэмп сацыялістычнага будаўніцтва. Калдагаворная кампанія гэтага году павінна замацаваць дасягнутыя посьпехі і гарантаваць паскарэньне тэмпаў рэканструкцыі народнае гаспадаркі. Тав. Конюхаў заклікае да **рашучага адпору ўсім рвацкім нездаровым настроям, якія выявяцца ў часе кампаніі; трэба падрыхтавацца да адпору тым элемэнтам, якія зробяць спробу скарыстаць нашы труднасьці.**

Спрэчкі па дакладу т. Розіна паказалі, што многія з нашых нізавых прафесыяналістых і гаспадарнікаў яшчэ не ўявілі значэньня і задач калдагаворнай кампаніі гэтага году. Замест таго, каб сканцэнтраваць увагу на асноўных момантах кампаніі, каб дагаварыцца, як увязваць задачы абароны матар'яльных і бытавых інтарэсаў рабочых мас з задачамі выкананьня прамфінпляну, працаўнікі нізавых прафесыянальных арганізацый і кіраўнікі ўстаноў пачалі абмінавачваць адзін другога.

Гаспадарнікі т. Фрэйдэін (гарбарня «Бальшавік»), Радзіёнаў (працкалектыў «Утылізацыя»), Блюмкін (шчацінная фабрыка) абвінавачвалі працаўнікоў прафарганізацый у тым, што яны не дапамагалі рацыяналізацыі прадпрыемстваў, перагляду расцэнак і г. д.

Тав. Фрэйдэін, напрыклад, адзначыў, што прафпрацаўнікі не выступаюць супроць рвацкіх настрояў асобных рабочых, што гаспадарніку самому прыходзіцца «аддувацца» на рабочых сходах.

Калектыўны дагавор падпісвае Белскуртрэст, які часта ня ўлічвае думак непасрэднай адміністрацыі заводу.

Рабочыя актывістыя т.т. **Аін** (гарбарня «Бальшавік»), **Даніловіч, Лясевіч** («Бальшавік»), **Алой** (абутковая фабрыка), **Любік** (Цэнтрасыпірт) адзначылі, што гаспадарнікі, цікавячыся выкананьнем прамфінпляну, часта забываюць аб дрэннай якасьці прадукцыі.

Тав. **Бержбаловіч** (рэдакцыя газэты «Зьвязда») спыніўся на ўдзеле нізавога друку ў калдагаворнай кампаніі. Працаўнікі партыйных і прафесыянальных арганізацый часта недаацэньваюць ролі насьценгазэт у правядзеньні кампаніі.

Пасьля заключнага слова т. Розіна сход актыву прыняў рэзалюцыю па дакладу і пастанову, якая вітае ініцыятыву дніепрапятроўскіх мэталістых.

Б.

Працоўныя БССР адправілі ў Маскву і Ленінград 6 чырвоных эшалёнаў з бульбай

ДАЛЕЙШАЯ ПАГРУЗКА БУЛЬБЫ ІДЗЕ УЗМОЦНЕНЫМ ТЭМПАМ

Ня гледзячы на дрэнныя ўмовы надвор'я і рад тэхнічных труднасьцяй, зьвязаных з немагчымасьцю ў кароткі тэрмін падвесьці да станцыі і пагрузіць вялікую колькасьць бульбы, нашы арганізацыі добра справіліся з пастаўленай перад імі задачай. **Па заданьні на ўчарайшы і пазаўчарайшы дзень павінна было быць адгружана чатыры эшалёны; фактычна-ж адгружана 6.**

Як мы паведамлялі ўжо пазаўчора а 1-й гадзіне дня з Менску ў Маскву **адыйшоў першы чырвоны эшалён.** Пазаўчора а 11 г. увечары адыйшоў з Менску ў Ленінград **дадатковы эшалён.**

Пазаўчора-ж ноччу **з Воршы ў Ленінград таксама адыйшоў** эшалён з бульбай беларускай сьпіртусавай прамысловасьці.

Учора а 7-й гадзіне раніцой з Менску ў Маскву быў адпраўлены **чацьверты па ліку эшалён.** А 12-й гадзіне дня з Менску ў Ленінград адыйшоў **пяты эшалён.**

Са Слуцку атрымана паведамленьне, што ўчора адпраўлены таксама **шосты чырвоны** эшалён, нагружаны бульбай саўгасаў Слуцкага раёну.

Бульбу для першых 6 эшалёнаў далі саўгасы, калгасы, каапэрацыя і прамысловасьць. У бліжэйшыя дні чатыры эшалёны накіроўваюць у Ленінград выключна беларускія калгасы.

У вогуле падвозка бульбы да чыгуначных станцый працягваецца з ранейшым тэмпам.

Заданьне па адгрузцы спэцыяльных эшалёнаў будзе ня толькі выканана ў тэрмін, але бязумоўна і перавышана.

* * *

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). З Гомеля накіраваны ў Ленінград першы чырвоны эшалён з бульбай. Зараз пачалася пагрузка другога эшалёну. Па акрузе заготоўлена яшчэ 300 тысяч пуд. бульбы.

ВОРША. (Па тэлеграфу). 25-га кастрычніка ўвечары накіраваўся на Ленінград эшалён № 5 у складзе 50 вагонаў з бульбаю. Дэлегацыі з Воршы выяжджаюць 26-га кастрычніка. Эшалён № 6 калгассаюзу будзе накіраваны на Маскву 28-га кастрычніка. Эшалён № 8 выйдзе на Ленінград 29-га кастрычніка.

Пагрузка бульбы ідзе ўзмоцненым тэмпам.

РАБОЧЫЯ ЧЫГУНКІ НЯ БРАЛІ УДЗЕЛУ Ў АБГАВАРЭНЬНІ КАЛДАГАВОРУ

„У нас няма часу для скліканьня рабочых сходаў"

Месяц таму назад на Менскім чыгуначным вузле быў атрыманы праект генэральнага дагавору паміж Наркаматам Шляхоў Зносін і ЦК чыгуначнікаў.

Мясцком № 1 малога рамонту замест таго, каб абгаварыць калектыўны дагавор у цэхах, сярод шырокіх мас рабочых, абмежаваўся тым, што абгаварыў праект дагавору на сваім пасяджэньні ў прысутнасьці 20 актывістых (мясцком аб'яднае 350 чалавек). Такім чынам, асноўная маса рабочых нічога ня ведала аб тым, якія зьмены ўнесены ў новы калдагавор у параўнаньні з мінулым, якія папраўкі ўнёс мясцком.

На запытаньне нашага супрацоўніка, чаму праект дагавору ня быў абгаворваны на сходах рабочых, старшыня мясцкому спакойна адказаў:

«Няма часу для правядзеньня сходаў. Дрэнна зьбіраюцца рабочыя. Шмат рабочых—у разьездах».

Нас ні ў якім разе не здавальняе адказ старшыні мясцкому. Мы павінны самым рашучым чынам асудзіць учынак мясцкому № 1, які зьніжае палітычнае значэньне калдагаворнай кампаніі. Нельга ні ў якім разе дапусьціць габінэтнага абгаварэньня калдагавору.

Трэба зараз-жа склікаць сходы рабочых, на якіх абгаварыць праект генэральнага дагавору.

Пералом у загатоўках бульбы

Па даных Наркамгандлю амаль па ўсіх округах БССР адзначаецца рэзкі пералом у справе загатовак бульбы. На 25-га кастрычніка адной с.-г. каапэрацыяй адгружана 464 вагоны з бульбай. Поўны вестак аб адгрузцы бульбы іншымі арганізацыямі яшчэ няма, але яны за апошнія дні значна павялічылі адгрузку.

З раду месц Беларусі паведамляюць аб арганізацыі бядняцка-серадняцкім сялянствам чырвоных абозаў з бульбай. Ня ўсюды каапэрацыя і інш. загатавіцелі падрыхтаваны да прыёму чырвоных абозаў. Пазаўчора ў Менску меў месца такі выпадак. Ад чырвонага абозу калгасьнікаў, якія прывезьлі каля 12.000 пуд. бульбы, апошняя прымалася вельмі павольна. Для ўзважваньня бульбы была ўстаноўлена толькі адна вага. Калі-б Наркамгандаль не ўмяшаўся, і ня прывезьлі б яшчэ вагі, дык сяляне прымушаны былі-б чакаць цэлы дзень.

Згодна паведамленьню з Гомеля і Віцебску ў радзе месц адчуваецца недахват сродкаў. Наркамгандлю тэрмінова паставіў пытаньне перад эканамічнай нарадай аб выдзяленьні патрэбных сродкаў на загатоўку бульбы.

Улічваючы магчымасьць затрымак з пагрузкай бульбы па тэхнічных умовах Наркамгандлю тэлеграфна запрапанаваў акрангандлям падрыхтаваць належныя склады пры станцыі.

Яшчэ 5 рабочых брыгад на загатоўкі

Для ўзмацненьня загатовак хлеба і бульбы ўчора выехалі ў саўгасы і калгасы Менскае округі 5 рабочых брыгад з 15 чал. У брыгады ўвайшлі 4 швэйнікі, 3 будаўнікі, 2 харчавікі, 2 тэкстыльшчыкі, адзін камунальнік, 3 хэмікі. Брыгады будуць працаваць ў саўгасах і калгасах 10-12 дзён.

Ад'езд рабочай дэлегацыі з чырвоным эшалёнам у Ленінград

Учора выехала ў Ленінград разам з эшалёнам з бульбай дэлегацыя з 5 рабочых і 2-х сялян. У дэлегацыю ўваходзяць т. т. Круп (чыгуначнік), Бондарчык (гарбарня), Баросукоў (чыгуначнік), Цыпкін (мэталіоты), Лоташонак (рабочы саўгасу «Дукоры»).

Нездаровая канкурэнцыя

Інспэктар менскага акргандлю абсьледаваў ход загатовак бульбы ў раёнах Менскай акругі. У выніку выявілася, што паміж загатоўчымі арганізацыямі **ў радзе месц наглядаецца канкурэнцыя і ажыятаж.** Асабліва ў гэтым адзначаюцца агенты «Продуктпереработки», якія нераманьваюць сялянскія фурманкі з хлебам да сябе. З імі канкуруюць працаўнікі Рудзенскага спажывецкага таварыства, якія **парушаюць устаноўленыя канвэнцыйныя цэны.** Факты парушэньня канвэнцыйных цэн на бульбу мелі месца таксама і ва Ўзьдзе і Негарэлым. Агентура «Продуктпереработки» засьмечана чужым элемэнтам.

У зьвязку з гэтым Менскі акргандаль папярэдзіў кіраўнікоў акруговых загатоўчых арганізацый, што ў далейшым за парушэньне канвэнцыйных цэн і ажыятаж на рынку бульбы будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці як кіраўнікі нізавых загатоўчых пунктаў, так і акруговых.

* * *

Менскі акргандаль абавязаў акруговы с.-г. крэдытны саюз пад асабістую адказнасьць кіраўніка спагнаць да 15-га лістапада ўсю закантрактаваную бульбу, прыцягваючы вінаватых у несвяўчасовай здачы закантрактаванай бульбы да адказнасьці.

„ПАМЫЛКІ", ЯКІЯ МЯЖУЮЦЬ З ЗЛАЧЫНСТВАМ

ПРАВАЯ ПРАКТЫКА МАЗЫРСКАГА АКРФА

СОТНІ КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК ВЫЗВАЛЕНЫ АД ІНДЫВІДУАЛЬНАГА АПАДАТКАВАНЬНЯ. ПАРТЫЙНЫЯ І САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ЦІКАВІЛІСЯ ГЭТАЙ СПРАВАЙ. БЕДНАТА НЯ БЫЛА ПРЫЦЯГНУТА ДА ВЫЯЎЛЕНЬНЯ ПРЫБЫТКАЎ КУЛАКОЎ

„Асьцярога" Акрфа ў ападаткаваньні папоў

Факты, якія выяўлены пры абкладаньні кулацкіх гаспадарак у Мазыршчыне, сьведчаць аб тым, што савецкія і партыйныя органы акругі не зьвярталі на гэту справу досыць увагі. Да гэтага пытаньня в першага моманту кампаніі быў вельмі «асьцярожны» падыход. Зусім справядлівая думка аб тым, каб не закрануць індывідуальным абкладаньнем серадняка, прывяла **на практыцы да кепскага становішча з выяўленьнем і абкладаньнем кулакоў.**

Закон дазваляе АВК, выходзячы з мясцовых асаблівасьцяй, унесьці неабходныя зьмены ў пералік адзнак для індывідуальнага абкладаньня. АВК не скарыстаў гэтага права. Зусім відавочная адзнака непрацоўнага даходу, як даход ад рэлігійнага культу, у пастанову АВК ня ўключана. Трэба адзначыць, што НКФ у свой час зьвярнуў увагу акрфа на гэту палітычную памылку і прапанаваў мець на ўвазе даход ад рэлігійнага культу пры абкладаньні кулакоў у раёнах. Між тым, весткі аб выніках абкладаньня папоў па значнай колькасьці раёнаў паказваюць, што індывідуальным парадкам абкладзен адзін поп, які «ўжывае наёмную працу». «Асьцярога» акрфа ў абкладаньні папоў была вельмі вялікая. Так, некаторыя раёны абкладалі папоў і іншых рэлігійнікаў па сваёй асабістай ініцыятыве, кіруючыся пры гэтым добрым клясавым пачуцьцём. Але акрфа ў ролі «строгага дзядзькі» скасоўваў такія пастановы. Так, напрыклад, у Каралінскім раёне Скародзінскім сельсавеце, ёсьць поп **Мачульскі,** ён мае 6 штук буйной жывёлы, прыбытак ад сельскай гаспадаркі 423 руб., непрацоўны даход ад царквы 360 руб. Гэты поп абкладзен РПК у індывідуальным парадку, як кулак. Акруговая падатковая камісія пашкадавала гэтага папа. Па яе думцы гэты поп ня кулак, а сераднячок, таму яна скасавала пастанову РПК. У тым-жа раёне абкладзены дзяк **Бойка.** АПК скасавала і гэту пастанову РПК.

Млынары вызвалены ад індывідуальнага падатку

У інструкцыі адзначана, што да залічэньня ў катэгорыю найбольш багатых кулакоў **мэтазгодна** кіравацца ўсім даходам гаспадаркі, і калі гэты даход больш за 500 руб., то мэтазгодна лічыць такую гаспадарку кулацкай. З прыведзенага відаць, што аднака кулацкай гаспадаркі (у 500 руб.) прыведзена, як прыклад, як арыентоўка. Па думцы-ж акрфа гаспадарка, якая абкладаецца ў індывідуальным парадку, павінна абавязкова мець ня менш 500 руб. даходу ад сельскай гаспадаркі. Таму млынар Гутман у Пятрыкоўскім раёне з нязначным даходам ад сельскай гаспадаркі, але з вялікім даходам ад млыну — ад індывідуальнага абкладаньня вызвален акруговай падатковай камісіяй. Другая гаспадарка Сідзельская ў Капіцьцеўскім раёне з даходам ад сельскай гаспадаркі ў 551 руб., якая мае 13 штук жывёлы, таксама вызваляецца ад індывідуальнага абкладаньня АПК. Калі моцных папоў і млынароў акрфа ня лічыць кулакамі, то адсюль раёны робяць адпаведныя вывады ў сваёй практычнай дзейнасьці.

40 кулацкіх гаспадарак ападаткаваны звычайным парадкам

Вось, напрыклад, Калінкавіцкі раён, бліжэйшы да акруговага цэнтру. У гэтым раёне працуюць клясава-вытрыманыя таварышы; працуе лепшы ў БССР загадчык фінчасткі тав. Шпак. Але апартуністычны «тон» акрфа ў справе абкладаньня кулакоў зьявіўся атрутай для гэтых таварышоў. Сельсаветы ў Калінкавіцкім раёне выявілі каля 145 кулакоў, а РПК з працай сельсаветаў не згадзілася і адмяніла палову выяўленых кулакоў, сярод якіх шмат млынароў, уласьнікаў часалень і маючых іншыя адзнакі кулацкай прыроды гаспадаркі. Так, напрыклад, у Пруткоўскім сельсавеце абкладзен звычайным парадкам млынар **Лыс** з даходам ад 2-х пастаўнога млыну каля 400 руб., у Дзюдзіцкім сельсавеце млынар **Сычкан** Мікола, у Гулевіцкім сельсавеце млынар Карнеевец Пётра і шмат іншых.

Праверка вучотных картак, якія ёсьць у раёне, паказвае, што РПК ня ўбачыў многіх кулацкіх гаспадарак. **Каля 40 гаспадарак, якія маюць непрацоўныя даходы, пералічаныя ў законе, абкладзены ў звычайным парадку.**

У Дуліцкім сельсавеце «памылкі» з абкладаньнем кулакоў мяжуюць з злачынствам. У гэтым сельсавеце выяўлены ўсяго 3 кулакі. Між тым, агляд вучотных картак дае падставу для абкладаньня 12 кулакоў, якіх сельсавет чамусьці не заўважыў. Калі старшыні сельсавету пералічылі гэтыя гаспадаркі, ён згадзіўся з тым, што іх можна абкласьці як кулакоў. Паўстае пытаньне: а чаму гэтага ня ведаў сельсавет раней да прыезду «начальства» з раёну або акругі?

Партячэйка і іншыя арганізацыі зьвяртаюць на справу абкладаньня кулакоў мала ўвагі. **Ніколі пытаньне аб індывідуальным абкладаньні не стаяла на пасяджэньнях савецкіх і партыйных органаў.** Сярод беднаты не вялося ніякай працы на гэту тэму. Таксама дрэнна абстаяла справа ў райкоме.

З.

ПАБУДОВА ВЯЛІЗНАГА АГРА-ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА КАМБІНАТУ

Камбінат будзе трымаць каля 60.000 галоў малочнае жывёлы. 300.000 пуд. масла ў год

Пры Белкалгассаюзе адбылася нарада з удзелам прадстаўніка ўсесаюзнага савету калгасаў т. Таратуты, прадстаўнікоў НКЗ, НДІ, с.-г. каапэрацыі, Белсельтрэсту, РСІ і ВСНГ. Тав. Таратута зрабіў інфармацыю аб тым, што зараз па ўсіх саюзных рэспубліках стварацца ўзорныя агра-індустрыяльныя камбінаты. Камбінаты гэтыя будуць будавацца па апошнім слове агранамічна-індустрыяльнай тэхнікі. Такі-ж агра-індустрыяльны камбінат павінен быць пабудаваны і ў БССР, прычым ён павінен мець жывёлагадоўчы ўхіл з такім разьлікам, **каб трымаць ад 60.000 да 45 тысяч галоў малочнае жывёлы. Такая гаспадарка зможа даць каля 300 тысяч пуд. масла ў год.** Усе працэсы работы ў гэтым камбінаце будуць мэханізаваны з ужываньнем электрычнасьці.

Па думцы т. Таратуты такі камбінат мэтазгодна арганізаваць у Віцебшчыне, дзе ёсьць разьвітыя шляхі зносін як водныя, так і чыгуначныя, а таксама і пасойныя дарогі. Акрамя таго ток Асінбуду таксама зможа быць скарыстаны. **На пабудову гэтага камбінату будзе затрачана каля 5 млн. руб.** Да 1-га сьнежня павінен быць прадстаўлены праект ажыцьцяўленьня пабудовы гэтага камбінату.

Выступіўшыя ў спрэчках таварышы згадзіліся з прапановай т. Таратуты, але адзначылі, што ў БССР больш падыходзіць для гэтага як па кліматычных, так і па глебавых умовах, **Рагачэўскі раён, Бабруйскае акругі.** Некаторыя прамоўцы адзначылі, што 5 млн. руб. мала для пабудовы такога вялізнага прадпрыемства.

У выніку пастаноўлена было арганізаваць камісію з прадстаўнікоў Дзяржпляну, НДІ, Наркамзему, Белкалгассаюзу і ВСНГ. Камісія выехала на месца, каб канчаткова выбраць найбольш спрыяючы для пабудовы гэтага камбінату раён. Пасьля гэтага будзе прыступлена да стварэньня эскізнага пляну агра-індустрыяльнага камбінату, які будзе ўнесены на разгляд СНК БССР.

Праз чатыры дні пачынаецца справаздачна-перавыбарчая кампанія рэдкалегій насьценгазэт

Рэдкалегіі, рабкоры, селькоры, ці падрыхтаваліся вы да перавыбараў. Райкомы партыі, ячэйкі, праверце, што зроблена вамі ў выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б аб перавыбарчай кампаніі

НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАСТРЭЛЬШЧЫКАМІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ВЁСКІ

Усе мы ўжо ведаем аб тым, які вялікі размах у апошні час набыла ў нас на Беларусі калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Не малую ролю ў гэтай справе адыграў наш друк. Мы маем цэлы рад прыкладаў, калі ўзьнікалі калгасы дзякуючы працы нашых як друкаваных, так і насьценных газэт.

Насьценгазэта **«Іскра ў вёсцы»,** піша сакратар калгаснай партыйнай ячэйкі **т. Рыбакоў** (Горацкі раён, Аршанскай акругі) адбівала і дапамагла ва ўсёй працы на арганізацыі калгасу «Зара». Газэта выкрыла падрыўнікоў арганізацыі калгасаў, якія пайшлі пад суд. **У выніку працы газэты арганізаваўся другі калгас «Надзея».**

Насьценгазэта **«Засажэўская»** (Кармянскі раён, Магілеўскай акругі) дапамагла правядзеньню суцэльнай калектывізацыі Старадумсакага сельсавету. Праз насьценгазэту **«Зорка»** (калгас «Чырвоны Сьцяг» Лоеўскі раён, Гомельскай акругі) уцягнута ў калгас шмат сялян. Толькі праз адны выклікі ў гэтай газэце уступіла ў калгас каля 15 бядняцкіх і серадняцкіх сем'яў.

Ня меншае значэньне мае насьценгазэта ў працы самых калгасаў. Газэта абгаворвае як дасягненьні, таксама і недахопы ў працы і жыцьці калгасаў, дапамагае ўкараненьню здаровых пачаткаў у быт калектывістых, выкрывае спробы кулакоў пралезьці ў калгас.

Дзякуючы працы насьценгазэты **«Ільлічоўка»** (калгас Арэхаўка, Полацкай акругі), у калгасе разгорнута самакрытыка, узьнята прадукцыйнасьць працы саміх калгасьнікаў, палепшылася згуртаванасьць паміж калгасьнікамі.

Сакратар партыйнай ячэйкі калгасу **«Чырвоны берег»** т. Ільлюшанка расказвае, як іх насьценгазэта **«Чырвоны Араты»** дапамагае весьці антырэлігійную барацьбу. У выніку працы газэты некаторыя калгасьнікі, у якіх віселі абразы, павыкідалі іх.

Аб такіх станоўчых выніках працы калгаскіх насьценгазэт мы маем яшчэ цэлы рад фактаў (**«Новы быт»,** камуна імя Крапоткіна, **«Чырвоны Кастрычнік»**—Хоцімскі раён, **«Ільлічоўка»**—калгас імя «11 гадавіны Кастр. рэвалюцыі»). Усё гэта, аднак, не гаворыць абтым, што добра пастаўлена праца насьценгазэт ва ўсіх калгасах. Весткі, якія мы маем, нам гавораць, што **з 70 калгасаў,** цры якіх ёсьць партыйныя ячэйкі, выдаецца **толькі 28 насьценгазэт.** Газэты, выходзяць у большасьці нерэгулярна. А што-ж гаварыць пра тыя калгасы, дзе няма партыйных ячэек? Там справа стаіць бязумоўна яшчэ горш. Усё гэта сьведчыць аб тым, што нашы раённыя партыйныя камітэты і ячэйкі не зварачаюць належнай увагі на працу з селькорамі, на кіраўніцтва насьценгазэтамі. Проста кажучы, не даацэньваюць таго вялікага значэньня, якое мае наш нізавы друк. Аб чым іншым можа сьведчыць тое, што нават у такіх буйных калгасах, як **«Кастрычнік», «Пралетарская Свабода», «Ясная Паляна», «Камунар»** і інш., якія маюць звыш 1.000 гэкт. зямлі і пры якіх ёсьць партыйныя ячэйкі, да гэтага часу не арганізавана выданьне насьценгазэт.

IV усесаюзная нарада рабселькораў пастанавіла, каб пры ўсіх калгасах, якія маюць звыш 30 членаў, абавязкова павінны быць арганізаваны насьценгазэты. У тым, што на Беларусі ня выканана гэтая пастанова, у значнай меры падае адказнасьць таксама на нашы цэнтральныя і акруговыя газэты, якія зваракалі мала увагі на кіраўніцтва і дапамогу нават існуючым калгаскім насьценгазэтам.

Зараз у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі рэдкалегій насьценгазэт, мы павінны дабіцца, каб у кожным калгасе (які налічвае звыш 30 членаў) былі абавязкова арганізаваны насьценгазэты. Партыйныя ячэйкі, райкомы партыі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на працу калгаскіх насьценгазэт і арганізацыі вакол іх селькораў. Цэнтральныя і акруговыя газэты павінны выслаць у калгасы сваіх працаўнікоў для інструктаваньня ў працы рэдкалегій насьценгазэт і селькораў, а таксама больш рэгулярна пасылаць інструкцыйныя лісты. Праленьні і саветы калгасаў павінны вылучаць адпаведныя сродкі на выданьне насьценгазэт.

ВЕРЖБАЛОВІЧ.

Галавацяпы з саўгасу „Пагост"

Па БССР ідзе загатоўка жывёлы для адкорму. Для гэтай мэты патрэбны спэцыяльныя будынкі.

СНК Беларусі пастанавіў пабудаваць у Беларусі каля 30 такіх будынкаў. Гэта будаўніцтва ўскладзена на Белсельтрэст, Наркамгандлю і г. д. Белсельтрэст, у сваю чаргу, даручыў пабудову хлявоў для жывёлы саўгасам.

Ня гледзячы на пастанову СНК, некаторыя саўгасы бюракратычна падыйшлі да гэтае важнае справы.

Так, вялікаму саўгасу «Пагост», Старобінскага раёну (Бабруйшчына) два месяцы таму назад было дана заданьне пабудаваць хлеў на 100 штук жывёлы. Гропы на будаўніцтва былі своячасова пераведзены, быў дастаўлены і цэмэнт. Дзякуючы цяганіне і галавацяпству загадчыка гэтага саўгасу т. **Сяргеева,** пабудова хлява для жывёлы і да гэтага часу не распачата.

Трэба адзначыць, што саўгас «Пагост» мае харчы (адкіды ад браварнай вытворчасьці) на 300 штук жывёлы, а таксама 20 тыс. пудоў сена. Гэтыя адкіды прыдзецца вылівацъ вон. Наркамгандлю перадаў гэту справу пракурору для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Як выконваюцца дырэктывы VIII-га зьезду прафсаюзаў

Пераход да сапраўднай самакрытыкі яшчэ ня зроблены

«...Рашуча змагацца за разгортваньне самакрытыкі, і асабліва самакрытыкі рабочых на фабрыках і заводах і рашуча выступаць супроць якога-б там ні было зажыму і адкуль-бы ён ня выходзіў. Прафарганізацыі павінны ўзяць на сябе функцыі арганізатараў самакрытыкі шырокіх рабочых мас для выпраўленьня недахопаў па ўсіх галінах працы».

(З пастановы VIII-га зьезду прафсаюзаў)

Фармальна пытаньне аб самакрытыцы абгаворана амаль што ва ўсіх праф'ячэйках. Але сапраўдны зрух у гэтай галіне зусім слабы. **Баязьлівасьць крытыкі і прасьледваньні за самакрытыку яшчэ далёка ня зжыты.** Так, на заводзе «Ільліч» адзін рабочы выступіў з крытыкай на сходзе ў часе агляду працы камісіяй ЦСПСБ, а пасьля сходу ў гутарцы заявіў: «я ведаю, што мне гэта крытыка даромна ня пройдзе».

Там, дзе значэньне самакрытыкі больш растлумачана шырокім пластом рабочых, яна шмат дапамагае ўдыму актыўнасьці рабочых і практычнаму зьнішчэньню недахопаў. Такое становішча наглядаецца і на фабрыцы «Чырвоная Вярэзіна» (Рагачоў). Асобныя рабочыя разглядаюць мерапрыемствы па падняцьці працдысцыпліны, як зажым. На заводзе «Камінтэрн» (Бабруйшчына) наглядаецца такое становішча, што **крытыкуюцца выключна недахопы гаспадарчай і праф. працы, а недахопы з боку больш адсталых рабочых** (як рвацтва, настрої цэхаўшчыны, парушэньне працдысцыпліны) **замоўчваюцца.**

Галоўнай небясьпекай усё-ж зьяўляецца недахоп у разгортваньні самакрытыкі і выпадкі зажыму. Такіх выпадкаў у вясковых прафарганізацыях яшчэ надта многа і больш, чым у горадзе. Вось некалькі найбольш яскравых прыкладаў. У Негарэльскім саўгасе пашыраны сярод рабочых погляд, што калі пакрытыкуеш, зьнімуць з працы. Гэты погляд знайшоў яснае пацьвярджэньне ў Тураўскай паказальнай станцыі. Там рабочага за выступленьне на сходзе з крытыкай зьнялі з працы, прычым дырэктар заявіў: «заткну горла кожнаму, хто будзе гаварыць дзерзасьці». Праўда, гэты рабочы потым зноў быў прыняты на работу, але на горшую. Пытаньне аб зажыме самакрытыкі ня было завострана перад рабочымі. Больш таго, на тэй-жа станцыі жорстка прыдушваліся спробы спэцыялістых займацца самакрытыкай. Так, калі адзін з маладых спэцыялістых напісаў заметку ў насьценгазэту, на яго наваліўся дырэктар, які на пасяджэньні вучонага савету доўга яго муштраваў і даводзіў, што непатрэбна спэцыялістам крытыкаваць свайго калегу-спэцыялістага перад «неадукаванымі рабочымі».

У саўгасе Высокае прыехаў прадстаўнік саюзу і расьтлумачыў рабочым сутнасьць самакрытыкі. Рабочыя ўясьнілі значэньне самакрытыкі і сталі тут-жа на сходзе выяўляць рад злачынстваў з боку адсталых рабочых. Але рабочыя не падрыхтаваным. Ён паехаў і ўсё засталося пастарому. Тады асобныя рабочыя паслалі заявы аб злачынствах адміністрацыі ДПУ і сьледчым органам, якія прынялі адпаведныя меры. Злачынцы былі зьняты з працы і прыцягнуты да судовай адказнасьці. Але рабочыя пасьля гэтага лічаць, што няма сэнсу займацца самакрытыкай на месцы. Самакрытыка ў саўгасе Высокае і зараз у заняпадзе. Вось да чаго можа прывесьці факт няўменьня саюзнай арганізацыі стаць на чале самакрытыкі.

Сярод членаў нявытворчых саюзаў ёсьць рад фактаў ухіленьня ад самакрытыкі («не палезу ў самакрытыку, бо не хачу нажываць ворагаў», «мы крытыкаваць ня хочам, бо тут начальства замешана» і інш.).

Усё гэта сьведчыць аб тым, што пры фармальным абгаварэньні і растлумачэньні лёзунгу самакрытыкі, **пераход да сапраўднай, разгорнутай самакрытыкі яшчэ не праведзены.** Прафарганізацыям яшчэ прыдзецца правесьці значную працу для таго, каб дабіцца ажыцьцяўленьня гэтага важнейшага лёзунгу партыі.

САЦСПАБОРНІЦТВА Ў ВЯСКОВЫХ ПРАФ'ЯЧЭЙКАХ

У сацспаборніцтва ўступілі амаль што ўсе праф'ячэйкі. У цэлым радзе выпадкаў сацспаборніцтва значна дапамагло палепшыць працдысцыпліну, зьнізіць сабекошт і наогул выканаць прамфінплян. Ёсьць асобныя прыклады прыстасаваньня культпрацы да задач сацспаборніцтва. Так, у Ленінскім раёне Скародзінскім сельсавеце, ёсьць поп **Мачульскі,** ён мае 6 штук буйной жывёлы, прыбытак ад сельскай гаспадаркі 423 руб., непрацоўны даход ад цар

Да зімовай кампаніі дапамогі палітзьняволеным

Ужо трэці год мопраўскія арганізацыі Беларусі праводзяць кампанію дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям на зімовы час.

Мопраўскія арганізацыі і ў гэтым годзе прымушаны праводзіць кампанію зімовай дапамогі ў зьвязку з апошнімі падзеямі рэвалюцыйнага ўздыму працоўных, прыгнечаных народаў у буйнейшых буржуазных краінах, што выклікае магутны рост белага тэрору, новых масавых арыштаў, узмацненьне фашыстоўскага руху, расстрэлаў рэвалюцыянэраў і шматгадовых катаржных прысудаў.

Дзесяткі тысяч лепшых нашых брацьцоў пакутуюць на выспах, у катаржных турмах і цёмных карцарах, галодныя, абарваныя і якія атрымлівалі сур'ёзныя хранічныя хваробы (сухоты, цынгу, экзэму і інш.). Голад, хваробы і адсутнасьць цёплай вопраткі і бялізны ў зімовы час яшчэ горш адбіваюцца на стане здароўя палітзьняволеных. Турмы вільготныя, халодныя і ў зімовы час нават не апаплёваюцца.

Тысячы жонак і дзяцей палітзьняволеных пакутуюць, застаўшыся без бацькоў, таксама ўдоў і сірот забітых рэвалюцыянэраў, бяспрытульныя, галодныя, без грошай, чакаюць нашай дапамогі, бо ў зімовы час іх становішча пагоршваецца (адсутнасьць цёплай вопраткі і бяз дроў).

Вялікі рост белага тэрору і фашызму, масавыя арышты, пакінутыя без дапамогі сем'і палітзьняволеных і пагоршаньне становішча палітзьняволеных у зімовы час, **патрабуюць ад усіх працоўных гораду і вёскі самай вялікай напружанасьці і актыўнасьці па зборы сродкаў у карысьць кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям.**

Праведзеныя кампаніі зімовай дапамогі ў 1927-28 годзе даказалі вялікую сьвядомасьць і адданасьць працоўных Менскай акругі ў дапамозе барацьбітом рэвалюцыі ў іх змаганьні за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю і зборам сродкаў: грашыма, вопраткай і на вёсцы натурай (жыта, бульба і г. д.). Усяго было сабрана 14.000 рублёў.

З 15-га кастрычніка Менскі акруговы камітэт Мопру пачаў праводзіць кампанію зімовай дапамогі. Ужо пачынаюць паступаць сродкі ў карысьць гэтай кампаніі, але трэба адзначыць, што пакуль тэмп гэтай кампаніі ідзе вельмі марудна і яшчэ нават яшчэ не разварушыліся.

Таму Менскі акруговы камітэт Мопру зварачаецца да ўсіх працоўных гораду і вёскі не забыць і ў гэтым годзе аб сваёй брацкай, пралетарскай салідарнасьці і пралетарскім абавязку па дапамозе ахвярам фашызму і іх сем'ям і з найбольшай актыўнасьцю зараз-жа разгарнуць працу па зборы сродкаў у карысьць кампаніі зімовай дапамогі. Ячэйкам Мопр' неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую агітацыйна-растлумачальную працу на прадпрыемствах і ўстановах, сярод рабочых і служачых, заклікаючы ўсіх на дапамогу барацьбітом рэвалюцыі і іх сем'ям.

Пакуль, каб на мясцох партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя арганізацыі, аказалі самае актыўнае садзейнічаньне ячэйкам МОПР'у ў больш пасьпяховым правядзеньні кампаніі зімовай дапамогі.

Трэба спадзявацца, што і ў гэтым годзе працоўныя Менскай акругі дакажуць на справе сваю інтэрнацыянальную салідарнасьць і сьвядомасьць падапамозе барацьбітом рэвалюцыі ў зімовы час і вызначаную суму для Менскай акругі (15 тысяч руб.) выканаюць з лішкам.

Кампанія зімовай дапамогі павінна быць скарыстана ўсімі ячэйкамі МОПР'у для папулярызацыі задач МОПР'у, вярбоўкі новых членаў у арганізацыю за лік працоўных гораду і вёскі.

ЦУДЗІН.

ЗА ДРЭННАЕ КІРАЎНІЦТВА

Беларускае бюро ЦК чыгуначнікаў пастанавіла зьняць з прафсаюзнай работы старшыню гомельскага вучпрафсожу тав. **Гараб'ёва**, які не апраўдаў надзей выбаршчыкаў.

Гомельскі вучпрафсож да гэтага часу не перайшоў на новыя мэтады работы, ня кіруе мясцкомамі, сацспаборніцтвам, ліквідацыяй няпісьменнасьці і г. д.

Прэзыдыум вучпрафсожу даў сваю згоду на мэханічнае скарачэньне 600 рабочых у сувязі з пераводам праўленьня Зах. чыгуначы ў Калугу і пераходам галоўных гомельскіх майстэрань з капітальнага рамонту на сярэдні. Між тым, частка скарочаных належыць да асноўнага кадру рабочых і ніякай гаспадаркі ня маюць, а сярод заставшыхся ёсьць шмат такіх, якія маюць свае гаспадаркі.

Тав. Гараб'ёў не кіраваў вучпрафсожам і ўхіляўся ад калектыўнай прапрацоўкі пытаньняў.

ЭКСТРАНАЯ НАРАДА гарадзкога актыву МОПР'у

Усім гарадзкім ячэйкам МОПР'у, усім членам і кандыдатам Менскага акругкому МОПР'у, усім членам і кандыдатам райкомаў МОПР'у, ўсім актывістым-мопраўцам.

СЕНЬНЯ, 27 кастрычніка, а 1-й гадз. дня ў клюбе імя К. Маркса

АДБУДЗЕЦЦА

ЭКСТРАНАЯ НАРАДА МОПРАЎСКАГА АКТЫВУ.

Абвестка дня будзе паведамлена на нарадзе.

Актывістыі! Усе на нараду без спазьненьня.

Мен. акругком МОПР'у.

АПА Менскага АК КП(б)Б паведамляе, што сёньня, а 8-й гадзіне ўвечары ў Доме камасьветы імя К. Маркса

АДБУДЗЕЦЦА

даклад Белкалгассаюзу для нізавога актыву

аб бліжэйшых задачах калгасізацыі.

Пасьля дакладу—кіно-фільм. Уваход па партыйных і камсамол. білетах.

МЕНСК

Абгаворым ліст днепрапятроўскіх мэталістых

(Завод «Камунар»)

На заводзе «Камунар» прыступілі ўжо да выбараў дэлегатаў ад цэхаў у агульна-заводзкую брыгаду па праверцы выкананьня калдагавароў. Брыгада будзе складацца в 20 чалавек.

Стары дагавор у большасьці выкананы, за выключэньнем пунктаў аб выдачы малака і ввышнормавай працы.

У бліжэйшыя дні **сход рабочых абгаворыць ліст днепрапятроўскіх мэталістых** наконт удзелу рабочых у калдагаворнай кампаніі.

Новая тэхнічная ВНУ ў Беларусі

Калегія НКА БССР пастанавіла адкрыць у Гомелі вышэйшую тэхнічную навучальную ўстанову. НКА просіць СНК замацаваць за ВТНУ будынак праўленьня Заходняй чыгункі, які зараз вызваляецца ў зьвязку з пераездам праўленьня ў Калугу. Новую ВТНУ мяркуецца адкрыць у будучым годзе. Яна будзе складацца з наступных факультэтаў: мэханічнага з 3-ма аддзяленьнямі: с.-г. машынабудаўніцтва, сярэдняга машынабудаўніцтва і цепла-тэхнічнага аддзяленьня; будаўнічы факультэт з аддзяленьнямі па жыльлёвым будаўніцтве, фабрычна-заводзкай і санітарнай тэхніцы, факультэт па падрыхтоўцы інжынэраў-эканамістых.

Пэнсія мэдыцынскім работнікам за выслугу год

Наркамправы распрацаваў інструкцыю аб забесьпячэньні пэнсіяй за выслугу год мэдыцынскіх і вэтэрынарных работнікаў.

Права на пэнсію маюць усе мэдыцынскія і вэтэрынарныя работнікі, якія прапрацавалі ня менш 25 год і зараз працуюць у сельскіх мясцовасьцях. Пэнсія ўстанаўляецца ў разьмеры паловы сярэдняга месячнага заработку за апошні год.

Інструкцыя ўводзіцца ў жыцьцё з 1-га кастрычніка 1929 году.

Чаму менская пошта не пераходзіць на бесьперапынку

У той час, калі ўсе ўстановы ўжо перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень, менская пошта працуе пастароому. Гэта зрывае нармальную работу іншых устаноў. Калі прыходзіцца рабіць тыя ці іншыя апэрацыі з поштай у нядзелю, яна закрыта. Час і пошце перайсьці на бесьперапынку і працаваць пановаму.

Спынена індывідуальнае крэдытаваньне. МЦРК спыніў індывідуальнае крэдытаваньне. У далейшым крэдыты будуць выдавацца толькі калектывам.

Спорт

— Адбыліся фінальныя ігры па футболе на першынства паміж камандай мэталістых і «Дынама». Перамога засталася за камандай «Дынама» з вынікам 6:3.

— АСФК арганізоўвае ў лістападзе месяцы брыгады гарадзкіх фізкультурнікаў з рабочых менскіх прадпрыемстваў. Брыгады выедуць на вёску для практычнай дапамогі ў працы вясковых фізкультурных гурткоў.

Капярэдадні Кастрычніка

Менск рыхтуецца да сьвята

Пазаўчора адбылося пасяджэньне **акруговай камісіі па падрыхтоўцы правядзеньня Кастрычніцкіх сьвят.** Ужо выпрацаваны плян дэманстрацыі 7-га лістапада. У дэманстрацыі прымуць удзел 15 калён з рабочых усіх саюзаў. Камісіяй разьмеркаваны памяшканьні, у якіх можна праводзіць сходы, каб ахапіць вечарамі ўсіх рабочых.

Камісія запрапанавала МЦРК, каб у дні сьвяткаваньня былі адкрыты ўсе сталоўкі і спажывецкія крамы.

* * *

Саюз **працаўнікоў мастацтва** рыхтуецца да Кастрычніцкіх урачыстасьцяй. Па ўсіх мясцкомах абмяркоўваецца пытаньне аб дапамозе мастацкім гурткам на прадпрыемствах у правядзеньні канцэртаў, якія імі будуць наладжаны ў куткох і рабочых клюбаў.

У панядзелак адбудзецца шырокая нарада ўсіх мастакоў Менску для абгаварэньня пытаньня мастацкага афармленьня карнавалу і вечароў у клюбах. У карнавале, акрамя артыстых, прымуць удзел усе драматычныя гурткі клюбаў і прадпрыемстваў.

* * *

Праўленьне МЦРК адкрывае ў дні сьвята новы дзіцячы сад на 35 дзяцей пайшчыкаў.

Пры магазыне «Маці і дзіця» адчыняецца кансультацыя, якая будзе даваць адказы пакупцом на пытаньні, зьвязаныя з выхаваньнем дзяцей. У сталоўках заводаў «Бальшавік» і «Энэргія» ўстанаўляюцца два гучнагаварыцелі.

* * *

Менская Пушкінская бібліятэка арганізуе да Кастрычніцкіх сьвят кніжныя выстаўкі і перасовачныя бібліятэкі з мэтай масавага абслугоўваньня рабочага чытача.

* * *

На **пабудовах** пачалося правядзеньне гутарак сярод сэзоньнікаў аб значэньні Кастрычніка. Пачынаючы з 6-га лістапада, на прадпрыемствах адбудуцца ўрачыстыя вечары для рабочых і жонак рабочых. Выпускаюцца спэцыяльныя нумары пасьцэнгазэт.

* * *

7-га лістапада ў Доме Культуры адбудзецца вечар - канцэрт **5-ці рабачкомаў Гандальбуду** разам з саюзам працаўнікоў мастацтва. Рыхтуюцца жывая і сьветавая газэты. У Доме Культуры адкрываецца выстаўка экспанатаў добрай і дрэннай работы рабочых будаўнікоў. На вечары будзе наладжаны палітычны аўкцыён. За лепшыя адказы на палітычныя тэмы будуць выдавацца прэміі.

* * *

Заўком **гарбарні «Бальшавік»** рыхтуе карнавал. У клюбе гарбароў адбудуцца рапішнікі для дзяцей рабочых.

* * *

Да Кастрычніцкіх сьвят канчаецца пабудова ў Менску 70-кватэрнага дому. На кафэльным заводзе адкрываецца новы клюб.

Падарунак чыгуначнікаў

Агульны сход рабочых таварнага і кавальскага цэхаў вагонных майстэрань ст. Менск-таварная пастанавіў у адзнаку 12-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі выпусьціць звыш пляну 5 вагонаў.

Кожны рабочы ўзяў на сябе абавязак адпрацаваць па некалькі гадзін звыш нормы.

За дзень

Арганізавана шахматна - шашачная сэкцыя. Пры ЦСПСВ арганізавана шахматна - шашачная сэкцыя, якая будзе кіраваць шахматна - шашачнымі гурткамі прафсаюзных арганізацый. Па адных толькі прадпрыемствах гарбарнай прамысловасьці ёсьць каля 100 шахматна-шашачных гурткоў.

Канфэрэнцыя працоўных яўрэяў. 2-га лістапада ЦСПСВ, яўбюро акругкому і рэдакцыя газ. «Акцябр» склікаюць гарадзкую канфэрэнцыю працоўных яўрэяў. На канфэрэнцыі будзе заслуханы даклад на тэму «Беларусізацыя, як сродак кіраўніцтва рабочай клясы сялянствам».

Назначэньне. Рэктарам беларускага антырэлігійнага унівэрсытэту назначаны праф. Нікольскі.

Будаўнічыя работы ўзімку. Гэтымі днямі пры Гандальбудзе адбылася вытворчая нарада па пытаньні аб правядзеньні будаўнічых работ узімку. На будаўніцтвах будзе занята каля 40 чал. Будуць працягвацца работы па пабудове 56-кватэрнага дому, клінік БДУ, каўбаснай фабрыкі, амбуляторыі і г. д.

4.000 рабочых экскурсантаў. Праз усебеларускую сельска-гаспадарчую і прамысловую выстаўку будзе прапушчана каля 4.000 рабочых-экскрсантаў з акруг БССР. Экскурсантам мяркуецца прадаставіць ільготны праезд на чыгунцы на 50 проц. Курсанты будуць разьмешчаны на начлег па клюбах і рабочых кватэрах.

Падрыхтоўка батрацка-бядняцкай моладзі ў ВНУ. Калегія НКА ўзбудзіла хадайніцтва перад СНК аб тым, каб адкрыць у Беларусі курсы для падрыхтоўкі батрацкай і бядняцкай моладзі, а таксама маладых калгасьнікаў для паступленьня ў ВНУ. Праз гэтыя курсы будзе прапушчана каля 200 чалавек.

На пабудову трактарнай калёны

Настаўніцтва і вучні Блоньскай школы сялянскае моладзі (Барысаўшчына) пастанавілі распачаць збор сродкаў на пабудову трактарнае калёны. **Настаўніцтва адлічае на гэту мэту свой аднадзённы заработак, а вучні—дзённую стыпэндыю.** Усяго ўжо сабрана 40 рублёў. Школа выклікае сельска-гаспадарчы тэхнікум, пэдтэхнікум, самігодкі горада Барысава раёну.

* * *

Рабочыя Капцэвіцкага заводу «Зьвязда» ўзялі шэфства над калгасам «Чырвоны Сьцяг». Рабочыя праводзяць адлічэньні з свайго заработку на закупку трактару для гэтага калгасу. Выкліканы пасьледаваць іх прыкладу заводы Мазыршчыны «Чырвоны Кастрычнік», «Пралетары» і «Праца».

СУД

Бацькі-зьвяры

Усё гэта адбывалася ў Козыраве пад Менскам. Арцельны старэйшына Стасюн, разьвёўшыся з жонкаю, неўзабаве ажаніўся ў другі раз, але не надоўга. Пражыўшы з жонкаю два месяцы, ён кідае яе і праз некаторы час бярэ трэцюю жонку. Шчасьцю «маладых» перашкаджалі двое дзяцей—хлопчык і дзяўчынка, якія засталіся ад першага шлюбу. Маладой жонцы яны не па душы, і яна з усёй шчырасьцю бярэцца за іх «выхаваньне». Цяжка сабе ўявіць, да чаго даходзілі вьдзекі з гэтых малых дзяцей. Мачыха не дае ім есьці і кормиць памыямі, якія бярэ ў вайсковых часьцях, што былі разьмешчаны недалёка ад дому Стасюна. Дзяцей часта бачылі, як яны зьбіралі ў памыйных ямах розныя аб'едкі. Выгнаныя з дому, яны начавалі ў сабачай будцы, каля ганку сваёй хаты. Але на гэтым «выхаваньне» не канчалася. Атарпаных, абарваных дзяцей моцна зьбівала мачыха. Характэрна, што і бацька, каб дагадзіць маладой сваёй жонцы, таксама зьдзекваў-ся з сваіх дзяцей. Так цягнулася доўгі час.

Суседзі, бачачы, як Стасюны глумяцца з дзяцей, паведамілі аб гэтым сьледчым органам і справа была выкрыта.

На допыце двеці трымаліся вельмі нясьмела. Не даюць адказу ні на адно пытаньне, а толькі маўчаць. Яны сьмяюцца несьвядомым сьмехам, сьмехам перажытых пакут... Мэдычная экспэртыза выявіла на целе набоі. Дзяўчынка акрамя таго была накіравана ў паравовую клініку для дадатковага мэдычнага агляду.

Гэтымі днямі справу ў паказальным парадку разглядаў у клюбе чыгуначнікаў народны суд 3-га вучастку пад старшынствам тав. **Мініна.** Суд выклікаў вялікую зацікаўленасьць сярод працоўных.

Стасюн прыгавораны на два гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, жонка—на 2 гады зьняволеньня. Абое пазбаўлены выбарчых правоў.

Працаўнікі вучоту прынялі шэфства над калгасамі

Рэспубліканскае бюро «АВП» (аб'яднаньне вучотных працаўнікоў) прыняло шэфства над трыма калгасамі Менскай акругі. Мэта шэфства — наладзіць вучот і справаздачнасьць у калгасах шляхам аказаньня неабходнай практычнай дапамогі. Для гэтага працаўнікі вучоту будуць сыстэматычна выяжджаць у калгасы.

Апрача гэтага мясцовыя групы «АВП» — пры ўстановах прынялі на сябе абавязак абслугоўваць у гэтым-жа напрамку 15 калгасаў.

Рэспубліканскае бюро прапанавала ўсім акруговым сваім філіялам таксама прыняць шэфства над калгасамі.

СЁНЬНЯ, 27 кастрычніка г. г. а 6 г. увеч. у памяшк. клюбу гарохавету склікаецца

АГУЛЬНЫ СХОД ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ ЖАКТ'аў

Парадак дня:

1. Аб падрыхтоўцы да сьвята Кастрычніканай рэвалюцыі.
2. Аб зборы тары для хлеба і бульба-загатовак.

Уваход на сход па білетах, разасланых па парт'ячэйках і ЖАКТ'ах.

Пасьля сходу—КІНО.

— 28 кастрычніка, а 6-й гадзіне ўвечары ў Доме Камуністычнае асьветы імя К. Маркса склікаецца **пашыраны сход актыву Фрунзаўскага раёну,** на які запрашаюцца члены бюро ячэек КП(б)Б, ЛКСМБ, члены ЦП саюзаў, фабзаўмясцкомаў, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, рэдкалегіі пасьценгазэт, кіраўнікі делегацкіх сходаў, заг. клюбаў і чырвоных куткоў. Члены ЦК, ЦКК, АК і АКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, АК ЛКСМБ, райкомаў партыі і ЦСПСВ праходзяць па сваіх мандатах.

Парадак дня:

Аб перазаключэньні і праверцы калдагавароў.

Білеты ў Фрунзаўскім райкоме.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Даводзіцца да ведама ўсіх студэнтаў, членаў і кандыдатаў КП(б)Б Беларускай с.-г. акадэміі, што пачалася чыстка парт'ячэйкі пры акадэміі.

Партыйцам, якія працуюць на вытворчасьці і падлягаюць чыстцы, трэба зьявіцца ў Перацу, бібліятэка імя Крупскай і бібліятэка імя Д. Беднага перайшлі на **бесьперапынны тыдзень.**

Усе аддзелы Пушкінскай бібліятэкі адкрыты штодзённа: навуковая чытальня ад 11—8 а палов. гадз. увечары, дзіцячая чытальня — 4—8½ гадз. увеч., выдача кніг на дом і запіс новых чытачоў па ўсіх аддзелах ад 4—8 а палов. гадз. увеч., архіў старых часопісаў і газэт — 2—6 гадз. увечары, перасовачны фонд — ад 11—5 а палов. гадз. увечары, чытальні бібліятэчных філіялаў адкрыты ад 2—8 а палов. гадзін увеч.

БІБЛІЯТЭКА.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“ | Ад панядзелка, 28 кастрычніка

ПРЭМ'ЕРА — МАСТАЦКІ БАЯВІК

Вытворчасьць—«Межрабпом-фільм»—выпуск 1929 г.

Па нашумеўшай п'есе—Б. ЛАЎРЭНЬЕВА. Сцэнары—Г. ГРЭБНЕРА

РАЗЛОМ

Рэжысэр—Л. ЗАМКОВЫ. Апэратар—Ф. АЛЯКСЕЯЎ

У галоўных ролях

Заслуж. артысты рэспублікі М. С. Нарокаў, І. Г. Гладкоў, А. Д. Сьміранін, М. А. Жданава, Л. Клубкова і інш.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ **КІНО-ХРОНІКА „САУКІНО“ № 56**

1. Пахаваньне чырвонаармейцаў, якія загінулі пры налёце кітайскіх банд; 2. Калгас «Гігант»; 3. Саўгас—«Чаква»; 4. Збор гарбаты

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

ЦЫРК У нядзелю, 27 кастрычніка і у панядзелак 28 кастрычніка **ЦЫРК**

Сто аншлягаў у Маскве — Сто аншлягаў у Ленінградзе

гастролі сусьветнага атракцыёна эўрапейскага ілюзіяністага-гіпнотызёра

КАСФІКІСА

Са сваімі 10-ю асыстэнтамі і самымі маленькімі ў сьвеце людзьмі (ліліпутамі).

КАСФІКІС вязе 3.000 кгр. багажу.

Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч. Каса адкрыта ад 12 гадз. дня.

50 к. Кошт публікацыі аб згубе даукманты

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Нядзеля, 27 кастрычніка для кавэрав. арцеляй і саматужн.-адзіночак. Білеты ў Менадд. Белсампрамсаюзу

Л. Бергельсон **ГЛУХІ**

Пачатак спэктакляў роўна а 8 з пал. гадз.

Клюб ДРУКАРОЎ

СЁНЬНЯ, 27 кастрычніка 2 лепшыя мастацкія фільмы ў 1 сеанс

2 БАЯВІКІ у 1 сеанс

I. НЯВОЛЬНІКІ МОРА. Маст. драма ў 7 част.

II. ПАМЫЛКА «ЕНЭРАЛА» СТРЭХІ. Бытавая сучасн. камэд. у 6 ч.

— КАРЦІНЫ СУПРАВАДЖАЮЦЦА МУЗЫКАЙ —

З прычыны працяжнасьці сеансаў—пачатак 1-га сеансу роўна а 6 з палов. гадз., 2-га—а 9 г. 15 м.

Білеты ўнасе клюбу ў нядзелю ад 4 гадз. дня

РЭСПУБ. БЮРО АРУ

ГАНДЛЁВА-КААПЭР. СЭКЦЫЯ АРУ

склікае на 28 кастрычніка а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Акрвыканкому (пляц Волі, 6-ы пад'езд, окленае памяшкан.)

АГУЛЬНЫ СХОД

рахункових супрацаўнікоў гандл.-кааапэр. устаноў

АДВЕСТКА ДНЯ: 1) аб балянсавай кампаніі, 2) аб сацспаборніцтве, 3) аб вучоце вэксальных апэрацый па сыстэме „Капрвучот“, 4) аб пляне працы сэкцыі. Яўка абавязкова.

БЕЛПАЛЯВОДСАЮЗУ для работы па насенаводзтве. — АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ — Прапановы з пазьнакам мінулай працы накіроўваць Менск, Сьвіслаць, 46. Белпаляводсаюз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“.

Ад панядзелка, 28 кастрычніка

МАСТАЦКІ НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ

Горная баляда

драма ў 7 частках з пралёгам.

Пачатак сэансаў роўна а 7 гадзіне увечары.

Каса—ад 5½ гадз.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Амэрыканская камэдыя ў 6 частках.

З 1-м КРАСАВІКОМ

Звыш праграмы—культурфільм у 3-х частках

ПАЛЯВАНЬНЕ на ГАРЫЛУ

Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Амэрыканскі баявік

РАДЫЁ І ЛЕЎ

Звыш праграмы: хроніка „Совкино“ № 57

Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Новы фільм выт. „Савкіно“

КАІН І АРЦЕМ

жыцьцёвая драма ў 6 частках.

Звыш праграмы кіно-хроніка „Савкіно“ № 54

Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР“

СЭРЦА АЗІІ (Афганістан)

Кіно-нарыс у 6 частках.

Звыш праграмы цікавая камэдыя

ЯНКА ПІЯНЭР у 1 частцы

Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і серадах ад 12 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

ГАСТРОЛІ сатырыка-юмарыстага

Льва БРАУНА

у новым арыгінальным рэпэртуары

НА ЭКРАНЕ—амэрыканскі баявік

ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА

трагэдыя ў 7 частках.

Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. 30 к.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.

Ад панядзелка, 28 кастрычніка

МАСТАЦКІ ФІЛЬФ

ЯК ЧАСАМ БЫВАЕ

драма ў 6 частках.

У галоўных ролях заслуж. артыстыя рэспублікі: Замычкоўскі, Барысаглебская і арт. Зоя Валеўская, Судзьбінін, Кіменка.

Звыш праграмы **хроніка Савкіно № 58.**

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. 15 х.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІЯНЭР“

(будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»)

Ад панядзелка, 28 кастрычн. цікавы фільм выт. «Совкино»

ЛЯСНЫЯ ЛЮДЗІ (УДЭ)

Краязнаўчы нарыс у 5 ч.

Звыш праграмы кіно-хроніка «Совкино», прысьвечаная міжнароднаму юнацкаму дню ў Маскве.

Каса адчынена штодня ад 2 г. дня. Па нядзелях і серадах каса—ад 12 гадз. Пачатак 1-га сэансу ад 2 гадз.

Цана білета 10 кап. Месцы нумараваныя.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

Усім прафэсыянальным, грамадзкім, дзяржаўным і кааапэрацыйным арганізацыям

Беларускае аддзяленьне „Центропосредрабис“

прымае заяўкі на мастацкую рабочую сілу (канцэртных груп і асобных артыстых усіх відаў мастацтва) для абслугоўваньня клюбаў, чырвоных куткоў і ўстаноў у дні сьвяткаваньні 12-й гадавіны Кастрычніканай рэвалюцыі

Таксама прымаюцца заяўкі на аркестры духавыя і струнныя розных складаў і на мастакоў-дэкаратараў, маляроў, графікаў, скульптараў і. г. д.

Усе заяўкі прымаюцца ў «БЕЛПОСРЕДРАБИСЕ» (пр. Леніскай і Унівэрсытэцкай № 31-26) штодзённа ад 10 г. раніцы да 5 г. увеч.

Даведкі па тэлефону № 3-24

Бел. аддзяленьне «Цэнтропосредрабис»

ЗАЎОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для ізаных кааапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. укосіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дваісцікапеечныя марк.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усенкабанк, бяг. рахунак № 682. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усенкабанк, Завочным курсам.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ

даводзіць да ведама ўстаноў, што

БЕЗ ПАПЯРЭДНЯЙ ЗГОДЫ ДЗЯРЖБАНКУ

катэгарычна

забараняецца адпраўка грузаў ПА ЧЫГУНЦЫ

на адрас **ДЗЯРЖБАНКУ**

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

Экстракт семенных желез

Приготовленная по способу проф. д-ра Брюнера

Отдел лаборатории косметики Гален в Москве

При отсутствии в местных аптеках и магазинах сангигиены лаборатория высылает не менее 2 флаконов по получении 25% задатка

Цена 1 флакона 2 рубля. Пересылка за наш счет

Врачам для испытания гратис

Прейскурант высылается бесплатно

Лаборатории косметики Гален Москва

Для здачы **АБВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА“** звяноце па тэл. **7-81**

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Вуч.-конская картка № 883, вайсковая кніжка, Максімен-кава Е. Н., выд. Чавуск. РВК. 985-986

Дзьва вуч.-конскія карткі Кос-трыца І. Ф. 987-988

Чл. білет саюзу СГЛР Кузь-міцкай Н. В. 989

Згублена пячатка Галоўчыцка-га сельраўчаму саюзу СГЛР, Нераўляне . раёну, Мазырск. окр. 990

100 КАРТИН

Подпишитесь на „Художественные сокровища СССР“, состоящие из 100 больших многокрасочных картин, представляющих собой точные копии с лучших мировых произведений, хранящихся в Третьяковской галлерее и других государственных музеях. „Художественные сокровища СССР“ выходят выпусками по 4 картины. Все картины печатаются на прекрасной бумаге, наклеенной на паспарту, размером 36×47 см. К каждой картине дается объяснительный текст, биография и гравюра автора.

ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ СОКРОВИЩА СССР

Цена за все 100 картин в коленном прочном переплете — 75 рублей. Условия рассрочки: при подписке — 5 рублей, а остальная сумма — равными по 3 руб. 50 коп. по получении каждого выпуска (первый выпуск высылается немедленно), пересылка 38 коп. за выпуск. Уплатившие всю подписную плату вперед получат переплет с первым выпуском и за пересылку не платят. Подписку адресовать: Москва, 6, Цветной бульв., 25, Художественному Акционерному Издательскому Обществу АХР